№№127–128
(3464–3465)

23 жніўня 2011 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

**Да ўвагі!**
*Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!*

www.nv-online.info

# Народная Воля

*На прастор, на шырокі разлог*
*Выхадзі, мой народ, грамадою...*

Якуб КОЛАС

## Вы яшчэ не спазніліся...

*31 жніўня ў Вас заканчваецца падпіска на "Народную Волю"? Не хвалюйцеся — у Вас яшчэ ёсць час для таго, каб прадоўжыць падпіску на верасень і наступныя месяцы: у паштовых аддзяленнях Вас чакаюць да 27 жніўня, у сталічных спецыялізаваных пунктах "Белсаюздруку" — да 24 жніўня.*

**Вы — з «Народнай Воляй«, «Народная Воля» — з Вамі.**

СІТУАЦЫЯ

# Куды «адлятаюць» беларускія куры?



Гэтым пытаннем зараз задаюцца многія: з паліц крам і рынкаў раптам зніклі куры. Танныя бройлеры ў апошнія тыдні сталі дэфіцытам. Набыць іх можна далёка не паўсюль, ды і кошты на іх ва ўмовах паўсюднай дарагоўлі падвысіліся — кіло бройлера зараз каштуе 16—17 тысяч рублёў. Але ж гэта не 30—50 тысяч, як кілаграм свініны альбо ялавічыны.

Яшчэ напрыканцы ліпеня міністр сельскай гаспадаркі Беларусі **Міхаіл Русы** звярнуў увагу на гэтую праблему і даручыў разабрацца з прычынамі дэфіцыту курэй у крамах. Версій знікнення птушкі з паліц было некалькі — ад таго, што вытворцы чакаюць істотнага павышэння коштаў на прадукцыю, да таго, што прадпрыемствам-вытворцам нявыгадна рэалізоўваць тавар унутры краіны, а выгадна везці яго ў блізкае замежжа, дзе ва ўмовах нестабільнай эканамічнай сітуацыі ў Беларусі ёсць магчымасць атрымаць за тавар валюту, больш моцную за беларускі рубель.

І што ж змянілася? На мінулым тыдні карэспандэнт "Народнай Волі" наведаў сталічны **Камароўскі рынак** — курэй-бройлераў там было няшмат. Прасцей сказаць, іх амаль не было. Гандляркі ў адзін голас тлумачылі: *"Дэфіцыт створаны не па нашай віне, проста камбінаты не пастаўляюць нам прадукцыю. Яна ў асноўным ідзе на Расію і іншыя краіны, такім чынам прадпрыемствы зарабляюць валюту..."*

Каб высветліць, ці гэта і ёсць галоўная праблема дэфіцыту курэй, "Народная Воля" патэлефанавала на буйныя беларускія птушкафабрыкі. Аднак на **агракамбінаце "Дзяржынскі"** нам адмовіліся назваць прычыну адсутнасці іх прадукцыі на паліцах сталічных крам: "*На пытанне, чаму ў Мінску стала меней нашай прадукцыі, я вам адказаць не магу...*" — адрэзаў начальнік аддзела збыту прадпрыемства **Павел Казакевіч**.

А вось намеснік генеральнага дырэктара па камерцыйных пытаннях і якасці **птушкафабрыкі "Дружба" Мікалай Карпейчык** даступна растлумачыў сітуацыю, якая склалася. Можна сказаць з упэўненасцю: птушкафабрыкі да дэфіцыту ніякага дачынення не маюць.

— *Напружанне існуе на ўнутраным рынку Беларусі,* — распавёў Мікалай Мікалаевіч. — *Калі ў мінулым месяцы мы забілі 3050 тон птушкі, то ў жніўні плануем павялічыць забой яшчэ на адну тысячу тон. Але па-ранейшаму птушкі не хапае. Меркаванне, што многае ідзе на экспарт прама з прадпрыемства, — памылковае. Што тычыцца нашай птушкафабрыкі, то аб'ём экспарту як складаў не больш за 22 працэнты ад вытворчасці, такім і застаецца. Мы, можа, і хацелі б яго павялічыць, каб зарабіць валюту, але ў першую чаргу павінны задаволіць унутраны рынак. Не зусім нам цікава гэта, але што зробіш, трэба карміць сваіх.*

**— Але чаму тады курэй няма на паліцах?**

— *Іх вывозяць. Напрыклад, наша прадпрыемства пастаўляе курэй на холадакамбінаты. Цяжка прасачыць, каму і як потым наша прадукцыя рэалізоўваецца, але відавочна: шмат беларускіх курэй вывозіцца ў суседнюю Расію. Тыя ж індывідуальныя прадпрымальнікі шмат іх купляюць і вывозяць. Мяжы з Расіяй няма, таму гэта не праблема. А там беларускія куры карыстаюцца попытам, бо суадносіны кошту і якасці задавальняюць спажыўца. Таму я вам скажу: у дэфіцыце курэй на паліцах беларускіх крам птушкафабрыкі не вінаваты*".

У той жа час, па даных Міністэрства фінансаў Беларусі, і агракамбінат "Дзяржынскі", і птушкафабрыка "Дружба" лідзіруюць па прыбытку сярод спецыялізаваных прадпрыемстваў. Так, у першым квартале бягучага года прыбытак агракамбіната "Дзяржынскі" склаў 15.858 мільёнаў рублёў, а птушкафабрыка "Дружба" зарабіла 11.075 мільёнаў.

Дзеля справядлівасці адзначым, што "курыны дэфіцыт" распачаўся ў Беларусі летам. Таму меркаваць, як вырас ці знізіўся прыбытак гэтых прадпрыемстваў, можна будзе пасля абнародавання новых даных.

**Віталь ГАРБУЗАЎ.**

## *Улады не дазваляюць правядзенне пікетаў у падтрымку Бяляцкага*

Як паведаміў БелаПАН калега Аляксандра Бяляцкага Уладзімір Лабковіч, заяўкі на правядзенне акцый падаваліся ў выканкамы як мінімум 18 гарадоў Беларусі, у тым ліку ў Мінску, Магілёве, Гомелі, Брэсце, Мазыры, Кобрыне. Ніводнага пікета ўлады не дазволілі.

Лабковіч таксама расказаў, што 19 жніўня з Алесем Бяляцкім, які знаходзіцца ў следчым ізалятары №1 МУС на вуліцы Валадарскага, сустрэўся адвакат. *"Выявілася, што Бяляцкаму не перадаюць лісты. Ён пакуль не атрымаў ні аднаго ліста — ні з тых, якія пісала яго жонка, ні з тых, якія пісалі яму мы",* — сказаў Лабковіч.

Як вядома, віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека, кіраўнік закрытага беларускімі ўладамі праваабарончага цэнтра "Вясна" Алесь Бяляцкі быў затрыманы ў Мінску вечарам 4 жніўня. 12 жніўня праваабаронцу прад'явілі абвінавачанне па частцы 2 артыкула 243 Крымінальнага кодэкса (утойванне даходаў у асабліва буйным памеры) і працягнулі тэрмін утрымання пад вартай на два месяцы.



## Лукашэнка ў Сочы сустрэўся з Мядзведзевым

*Пра што гаварылі? Што абмяркоўвалі? Па якіх пытаннях спрачаліся? Калі нумар газеты адпраўляўся ў друкарню, адказаў на гэтыя пытанні не было.*

**(Больш позняя інфармацыя — на нашым сайце www.nv-online.info.)**

ОБЩЕСТВЕННОЕ МНЕНИЕ

## *Олег МАНАЕВ: "Дайте людям свободу!"*

Анализируя сегодняшнюю ситуацию в Беларуси, социолог Олег Манаев сравнивает ее с той, что сложилась в Советском Союзе в конце 1970-х — начале 1980-х годов, именуемой *"эпохой застоя",* когда у молодежи фактически не было никаких перспектив.

*"Это называлось эпохой застоя, когда те "лифты", что поднимали людей вверх по карьерной лестнице, были практически заблокированы,* — отмечает эксперт. — *Сейчас все чаще специалисты проводят такую же аналогию: Беларусь начала напоминать те советские времена. "Лифты" начинают блокироваться самыми разными обстоятельствами".*

Единственным выходом из ситуации для многих белорусов представляется выезд на постоянное место жительства в другие страны. Однако Олег Манаев считает, что масштабы утечки мозгов могут переоцениваться и за границу уезжает все же не так много специалистов. Ведь, по официальной статистике, на постоянное место жительства ежегодно из Беларуси выезжают несколько тысяч человек. Беспокоит другая цифра — сколько белорусов **хотели бы уехать из страны**, если бы появилась такая возможность. *"На такой вопрос в ходе исследования, проводившегося два месяца назад,* ***почти 46%*** *ответили, что хотели бы уехать",* — отмечает социолог.

*"Надо разделять реальный процесс миграции (он не слишком масштабный) и потенциал. Потенциал, конечно, огромный. Если представить себе обычную нормальную страну — не важно, будь то на западе или на востоке, США, Канада, Япония, — таких цифр там и близко нет,* — говорит Олег Манаев. — *Эти цифры свидетельствуют о том, что в обществе, государственной системе, рынке труда явно что-то не в порядке".*

Эксперт считает, что сейчас настало время *"открыть все шлюзы",* а именно реформировать экономику, налоговую систему, дать свободу частным предпринимателям. *"Но в первую очередь нужно проводить политические реформы в социальной сфере. А если говорить совсем просто — дать людям свободу, которой за последние годы белорусы имеют гораздо меньше, чем лет 17—18 назад",* — подчеркнул Олег Манаев в интервью телеканалу "Белсат".

ДИСКУССИЯ

*В предыдущем номере "Народной Воли" мы предложили читателям задуматься над высказыванием бывшего председателя правительства Беларуси Вячеслава Францевича Кебича:* ***"Главная цель России — проглотить Беларусь без остатка".***

*Одним из первых откликнулся на предложение развернуть широкую дискуссию председатель Комиссии по экономической политике и реформам Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва* ***Василий Михайлович Шлындиков.***

# Переход на российский рубль — это прощай, Беларусь!



Я согласен с мнением Вячеслава Францевича Кебича, что важнейшей целью России является поглощение Беларуси. Для меня это тоже очевидно. Используются все возможные способы — от "союзного государства" до Единого таможенного пространства. Задействованы экономические рычаги. Активно муссируется идея введения в Беларуси российского рубля. Эта идея вбрасывается в наше сознание отдельными российскими лобистами под видом решения наших острейших проблем.

Все это приманка. Евро не смог решить экономические проблемы в Греции, а вот российский рубль в Беларуси наши проблемы решит. Плакать хочется от таких рассуждений.

Подобные предложения в завуалированной форме говорят нам о нашей ущербности, как бы подчеркивают, что без Владимира Вольфовича Жириновского мы не способны управлять своей страной. Давайте прямо скажем: перейдя на российскую валюту, мы тем самым откажемся от экономического, а затем нас уговорят отказаться и от политического суверенитета. Ну а тогда, кроме собственных чиновников и милиционеров, нам придется содержать и бесчисленную рать прожорливых московских столоначальников. Нам это надо?!

Убежден, что введение российского рубля или даже евро или доллара наших экономических проблем не решит. Они только более остро обнажатся, станут явными. Начнется массовое банкротство наших предприятий, усилится безработица.

Нужны экономические преобразования для смягчения наших экономических проблем, а проблемы есть сегодня и будут завтра. И эти преобразования надо вести со своей национальной валютой.

А в России своих проблем немерено. И я лично не хочу, чтобы за счет меня и всех нас "дядя из Москвы" решал свои проблемы или сколачивал очередной личный миллиард и покупал на Западе спортивный клуб или яхту.

Мы — соседи, у меня и у многих из нас в России друзья, товарищи, родственники. Но даже братьям лучше жить в отдельных домах, а не сообща в коммунальной квартире.

**Василий ШЛЫНДИКОВ, председатель Комиссии по экономической политике и реформам Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва.**

## *Лето возвращается*

К концу недели в Беларуси будет до +30. Уже в ночь на среду термометры покажут плюс 9—15 градусов, днем воздух прогреется до +20—26 градусов. В Брестской области ожидается до 28 градусов выше нуля. С четверга по субботу страна останется во власти солнечного антициклона. Осадков не ожидается. Ночная температура будет колебаться от 9 до 16 градусов тепла, днем от +21 до +28. По прогнозу, в воскресенье будет от 23 градусов тепла по северо-западу до плюс 31 градуса по югу страны.

ТЭМА ДНЯ

# Валютная гарачка

*Беларускі "заяц" худнее на вачах: за адзін долар — пры разліку з якім-небудзь іпэшнікам на рынку — трэба выкласці 8 тысяч "вушастых". І такое ўражанне, што "зайчыку" пагражае поўная дыстрафія...*

Такая немач нацыянальнай валюты б'е па кішэні перш-наперш шараговых грамадзян, бо куды ні сунься — усё прывязана да долара і еўра. Многія задаюцца пытаннем: і дзе тая мяжа, за якой хоць якая-небудзь стабільнасць, прыпыненне росту цэн на ўсё? Калі нарэшце спыніцца інфляцыйны разгон?

Простаму абывацелю складана разабрацца, што адбываецца. Яму смыліць адно: ці будзе далей яшчэ горш, ці варта ганяцца за доларамі па "шэрым" курсе, ці ўкладваць свае "кроўныя" ў мэблю, бытавую электратэхніку ды іншыя тавары? Нарэшце, яго цікавіць: ці магчыма яшчэ адна дэвальвацыя, якая для большасці можа стацца катастрофай? У такой сітуацыі ўжо не ведаеш, каму верыць, бо мы навучаны папярэднімі аракуламі, якія абяцалі і дэвальвацыю не дапусціць, і курс стабілізаваць, і напоўніць абменнікі замежнай цвёрдай валютай. Нічога такога і блізка няма — свабоднае падзенне працягваецца. І абсалютна не вядома, калі над нашымі галовамі раскрыецца выратавальны купал валютнага парашута... Застаецца хіба адно — маліцца ды слухаць парады дасведчаных людзей, розных фінансістаў, эканамістаў, незалежных экспертаў. Але і ў іх розныя меркаванні...

Напрыклад, **Станіслаў Багданкевіч** схіляецца да таго, што праз нейкі час курс стане крыху меншым. Спасылаецца на тое, што ўлады намецілі план дзеянняў, згодна з якім пад канец жніўня (але ж канец месяца на носе. — **Аўт.**) будзе прынята рашэнне аб стабілізацыі абменнага курса. Да таго ж, кажа ён, чакаюцца паступленні валюты ў выглядзе крэдыту пад залог "Беларуськалія". І ўсё гэта разам нібыта павінна стабілізаваць курс "зайчыка" адносна долара на больш нізкім узроўні. Спадар Багданкевіч упэўнены, што неабходна абмежаваць крэдытную экспансію, спыніць рост рублёвай грашовай масы. *"Думаю,* — кажа былы старшыня Нацбанка, — *павінна быць прынята рашэнне аб абмежаванні крэдытавання, скарачэння фінансавання дзяржвыдаткаў і тады, з улікам намечанай прыватызацыі, адзіны курс не дойдзе да 8000 за долар. Але могуць давесці і да гэтага, калі не памяняюць палітыку".*

Песімістычны погляд былога кіраўніка Нацбанка і на пытанне дэвальвацыі. Ён схіляецца да таго, што афіцыйная дэвальвацыя не праміне. Пытанне адно — да якога ўзроўню яна дойдзе? Чаму так?

*"Калі б дзяржава прымала ўсе неабходныя меры тады, калі іх трэба было прымаць, своечасова,* — *разважае Станіслаў Антонавіч,* — *то дэвальвацыя магла б спыніць долар на ўзроўні 6000 рублёў. Але ўлады цягнуць час і не робяць таго, што належыць.*

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ПАСЛЯ ПАДЗЕІ

## *«Варажбіт» прызямліўся ў Заслаўі*

*Даўно, відаць, гісторыка-культурны музей-запаведнік "Заслаўе" не прымаў столькі наведвальнікаў, як у мінулую нядзелю. Тут можна было пабачыць частку калекцыі музычных інструментаў са збору Івана Кірчука і музыкаў этна-трыо "Тройца" і паслухаць прымеркаваную да адкрыцця выставы праграму "Варажбіт".*

Усяго ў Заслаўі можна пабачыць каля 250 розных музычных інструментаў з розных краін свету, дзе выступалі музыкі "Тройцы", а таксама посцілкі, ручнікі, маскі. І літаральна пра кожную рэч Іван Кірчук, як адчувалася, гатовы быў расказваць з вялікай ахвотаю.

Зладзіць выставу было ініцыятывай менавіта заслаўскіх музейшчыкаў на чале з **Міколам Пагранoўскім**. Дый падрыхтаваўся музей да яе адкрыцця належным чынам: канапкі, гарбата, кава прапанаваліся наведвальнікам таксама бясплатна.

Пры ўсім гэтым неабходна памятаць, што ці не асноўная частка збораў музыкаў "Тройцы" да гэтага часу знаходзіцца ў Варшаве. Іван Кірчук тлумачыць гэта вельмі проста: гэтыя экспанаты ў Мінску элементарна няма дзе трымаць. Многія рэчы ўжо сапсаваліся без належнага дагляду і, лічыце, для беларускай культуры загінулі назаўсёды. Сёння этна-трыо "Тройца" практычна засталася без пакоя для рэпетыцый, дзе і зберагалася частка цяперашняй экспазіцыі ў Заслаўі. І можна толькі здагадвацца, які будзе лёс гэтых экспанатаў пасля таго, як тая выстава зачыніцца 30 верасня.

— Свае барабаны я зноў завязу на лецішча, — сумна сказаў удзельнік "Тройцы", выканаўца на ўдарных Юрый Паўлоўскі. — Іншага месца для іх проста няма...

**Дзмітрый ПАДБЯРЭЗСКІ.**

НЕЗАВИСИМАЯ ЭКСПЕРТИЗА

**Борис ЖЕЛИБА, профессор, доктор экономических наук**



# Западня в болоте

Как не вспомнить слова А.Лукашенко о том, в какое болото мы попали! И выбираться из него, оказывается, все тяжелее. Оно просто засасывает.

19 августа курс доллара на черном рынке подскочил до 8130 рублей, то есть вырос за неделю почти на 11%. Курс евро поднялся до 11.765, курс российского рубля — до 275 белорусских рублей.

Я не устаю с тревогой писать об этих проклятых курсах, потому что от степени девальвации реального обменного курса белорусского рубля впрямую зависит уровень инфляции в экономике, а значит, уровень жизни населения страны и здоровье бизнеса. В июле годовая инфляция по ценам на продовольствие достигла 53,5%. Дошло до того, что люди с утра занимают очередь за куриным мясом. К вечеру даже в гипермаркетах не найдешь свинины и говядины, несмотря на то что цены на них стали локомотивом инфляции. И это в столице! Такое впечатление, что власти, мягко говоря, попросту недооценивают остроту складывающейся ситуации. Как будто бездействуют.

Нет, они действуют. Но, судя по всему, по накатанной колее, с которой никак не могут сойти. Продолжается эмиссия безресурсных рублей. За июль объем широкой денежной массы вырос на 1,9%, примерно на 1,5 трлн рублей. Объем наличных денег в обращении — на целых 11,4% и достиг 7 трлн 59 млрд рублей. С начала года он увеличился на 57,1%, т.е. печатный станок работает вовсю. А ведь радикальное сокращение рублевой эмиссии являлось одним из главных пунктов еще весенней антикризисной программы правительства. Но органы госуправления, включая два главных банка страны, настаивают на продолжении усиленного кредитования экономики. К тому же идет уборочная кампания. Нацбанк неустанно продолжает поддерживать рублевую ликвидность двух главных коммерческих банков, кредитуя через них госпрограммы. Свои депозиты наращивает в госбанках и Минфин. В общем, опять надо выполнять ростовые валовые показатели. В результате двузначные темпы роста ВВП сменили двузначные показатели девальвации и инфляции. Чистые кредитные банковские ставки перевалили за третий десяток. Эмиссия необеспеченных денег, значительно опережающая темпы роста экономики и производительности труда, может бесконечно раскручивать инфляцию и девальвацию национальной валюты. Чтобы остановить кредитную экспансию, необходимо поднимать ставку рефинансирования как минимум до уровня инфляции, что Нацбанк и пытается постепенно делать. Резко нельзя. Дороговизна кредитов остановит бизнес, ударит по физическим лицам, которые взяли в банках деньги под процентную ставку, жестко привязанную к ставке рефинансирования.

Меж тем внешних заимствований в виде кредитов от Антикризисного фонда ЕврАзЭС, под залог акций "Беларуськалия" (если этот кредит состоится), валюты от продажи второй половины "Белтрансгаза" следует ожидать только осенью или позже. Но Нацбанк и правительство не находят ничего лучшего, как твердо и упорно стоять на официальном курсе доллара в 5000 рублей (с маленьким довеском). Внебиржевой межбанковский рынок наряду с ныне процветающим черным стал называться серым. На нем валюту свободно не купишь. Он разбился на сегменты "по понятиям". У Министерства промышленности "свой для своих", у других ведомств "свои для своих". Частный бизнес крутится как может. Даже предложения бизнеса разрешить субъектам хозяйствования занимать валюту у физических лиц Нацбанк заблокировал. Мол, это *"будет стимулировать развитие теневого валютного рынка"*. Кто же приложил для этого больше усилий, чем главный регулятор?

В который раз правительство Беларуси обнадежил российский премьер Путин. Он все же уступил давлению белорусской стороны и пообещал с окончательной продажей России "Белтрансгаза" уступить в цене на газ с 2012 года и применить понижающий, как он выразился, *"интеграционный коэффициент"*. Но это тактический выигрыш ценой продажи всей газотранспортной и газораспределительной системы страны. Экономика Беларуси вновь сидит на газовой и нефтяной игле, все больше погружаясь в зависимость от России.

Курс рубля отпускать на свободу надо? Надо. Но нет критических объемов валютных резервов его поддержать, а скорее — удержать. А без этого он взлетит так, что импорт вообще прекратится.

Ставку рефинансирования повышать надо? Надо. Но улетят банковские кредитные проценты так, что встанет вся экономика.

Если сразу резко нельзя, то надо делать постепенно, шаг за шагом. А пока все идет постепенно, спираль инфляции и девальвации продолжает раскручиваться, того и гляди совсем сорвется.

Зарплаты ограничивать надо? Тоже надо. А как, когда население с декабря и так уже обеднело более чем в два раза? Среднемесячные доходы белорусов за первое полугодие по официальному курсу, сообщает Белстат, составили 230 долларов. Просто западня!

Как бы там ни было, никуда не уходят вопросы стратегического характера. В первую очередь структурная реформа экономики. Впрочем, сегодня правительству не до нее.

Как только в белорусской экономике дела идут из рук вон плохо, на горизонте обозначается вопрос о переходе на российский рубль. Позиция России здесь давно понятна: хоть завтра. Не глядя ни на какую инфляцию и девальвацию белорусского рубля, что ранее служило камнем преткновения. Действительно, нам автоматически скостится российский долг, который не менее половины всех внешних заимствований Беларуси. Россия — основной торговый и, по сути, единственный на сегодня финансовый и кредитный партнер. Получаем в два раза более низкие внутрироссийские цены на энергоресурсы, сразу выравнивается торговый баланс. Избавляемся от белорусских фантиков и держим в руках если не банкноты мировых денег, то, во всяком случае, вполне солидные купюры, за которые свободно покупаем заветные доллары и евро. С введением российского рубля российскому капиталу по большому счету и скупать в Беларуси ничего не надо. Уходят почти все сугубо белорусские экономические беды. Но уйдут они вместе с экономическим суверенитетом. За ним, будьте уверены, уйдут и политический, и государственный суверенитет в целом.

Однако... Даже те, кому государственный суверенитет "до балды", пусть не надеются, что завтра у них будут российские зарплаты и пенсии. Их определяет уровень экономики, который еще долго останется белорусским. А шапку ломать по всем важным и не столь вопросам придется в Первопрестольной. Опыт уже имеется.

Так что из болота нужно выбираться, не теряя Беларуси, самого дорогого, что у нас есть.

РЕАКЦИЯ

# Уран не отдадим

*В ответ на введение Соединенными Штатами экономических санкций Беларусь замораживает совместные с США проекты по обмену высокообогащенного ядерного топлива.*

"*Белорусская сторона считает решение правительства США о введении экономических ограничительных мер в отношении Республики Беларусь необоснованным и неправомерным шагом*", — пояснил пресс-секретарь МИД Беларуси **Андрей Савиных**. Как отметил Савиных, санкции США — "*политически мотивированные решения, которые противоречат международным обязательствам США*", передает БелаПАН.

"*Введение новых американских экономических санкций идет вразрез с духом взаимодействия и сотрудничества. В этих условиях белорусской стороной принято решение о замораживании прорабатывающихся совместно с США проектов по обмену высокообогащенного ядерного топлива в рамках инициативы по снижению глобальной угрозы Министерства энергетики США, а также по созданию программы МБА при Белорусском государственном университете",* — заявил пресс-секретарь МИД.

При этом, подчеркивает Савиных, "*Беларусь по-прежнему будет обеспечивать физическую безопасность ядерного топлива в полном соответствии с международными обязательствами в области нераспространения".*

Напомним, 1 декабря 2010 года на саммите ОДКБ в Астане госсекретарь США **Хиллари Клинтон** и глава МИД Беларуси **Сергей Мартынов** выступили с совместным заявлением, в котором подтвердили приверженность своих стран ядерной безопасности и ядерному нераспространению.

Мартынов объявил, что Беларусь приняла решение о ликвидации всех своих запасов высокообогащенного урана и намеревается осуществить это к следующему саммиту по ядерной безопасности в 2012 году.

В свою очередь американская сторона заявила о готовности предоставить техническую и финансовую помощь для скорейшей ликвидации Беларусью запасов высокообогащенного урана.

И вот заявление: уран не отдадим!

РЭАЛІІ

# Зноў падманулі

*20 жніўня — шосты раз у гэтым годзе — у Беларусі падаражэў бензін.*



Зараз цана 1 літра паліва складае:

**"Нармаль-80" — 4240** рублёў (на пачатку 2011 года — **2250** рублёў),

**Аі-92 — 4460 (2870) рублёў,**

**Аі-95 — 4800 (3240) рублёў,**

**дызельнае паліва — 4720 (2580) рублёў**.

Толькі ў III квартале гэта ўжо другое павышэнне, у выніку чаго цана на паліва з 1 ліпеня па 20 жніўня падскочыла ў цане ў сярэднім на **6 працэнтаў**. Хаця ў чэрвені пасля масавай акцыі пратэсту "Стоп, бензін!" чыноўнікі Адміністрацыі прэзідэнта запэўнілі, што паліва — сацыяльна значны тавар і кошт на яго можа павялічвацца ў квартал не больш як на 3—5 працэнтаў.

*— Цяпер пытанне павышэння цэн на сацыяльна значныя тавары знаходзіцца на асобым кантролі, у тым ліку і ў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь,*— сцвярджалася ў адказе Адміністрацыі прэзідэнта актывістам грамадскай кампаніі "Стоп, бензін!". — *Далейшае павышэнне цэн магчыма толькі штоквартальна, але не больш як на 3—5 працэнтаў".*

Але ж чыноўнікі сваё слова зноў не стрымалі.

У афіцыйных паведамленнях, праўда, сцвярджаецца, што канцэрн "Белнафтахім" вымушаны пайсці на такі крок у мэтах паэтапнага раўнавання цэн на тавары ў краінах Мытнага саюза. Робіцца акцэнт на тое, што кошты на паліва ў Беларусі застаюцца ніжэйшымі, чым у Расіі, на 3 працэнты. Але чамусьці не робіцца паралель з заработнымі платамі ў Беларусі і Расіі. А яны зараз адрозніваюцца амаль у два разы. **Сёння сярэдняя зарплата ў Расіі складае 689 долараў ЗША, а ў Беларусі — 356 долараў па афіцыйным курсе, а па неафіцыйным — і ўвогуле каля 220!**

**Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.**



ХОРОШИЙ ПРИМЕР

## Минску бы такие электровелосипеды

В Вильнюсе проживает людей в несколько раз меньше, чем в Минске. А вот об экологии столицы соседи, похоже, заботятся лучше, чем мы, белорусы. Чтобы уменьшить выброс выхлопных газов, в Вильнюсе решили пойти на активное использование электровелосипедов. В середине августа десятки таких средств передвижения появились в центрах туристической информации, размещенных в разных точках города.

Пока в рамках экологического проекта действуют четыре пункта проката электровелосипедов, а вскоре их будет гораздо больше.

**Александр ДУБНОВИЦКИЙ.**

*Чалавек, які баіцца, памірае кожны дзень. А смелы — толькі адзін раз.*

*(Народная мудрасць.)*

## Воруют не брильянты, а детские рюкзаки

*В преддверии школьного сезона некоторые жители Витебска завели странную моду. За пару дней зафиксировано несколько попыток кражи детских рюкзаков.*

Сперва милиция с поличным задержала неработающих ранее судимых 27-летних мужчину и женщину.

Из секции "Канцтовары" крупного универмага они хотели стащить шесть рюкзаков и пачку бумаги. Ущерб для магазина не очень большой — 478 тысяч рублей, но все равно по данному факту возбуждено уголовное дело по статье "Кража".

Буквально на следующий день из уличной торговой палатки Витебского универмага две женщины пытались украсть семь школьных рюкзаков. Спрятать добро они пытались в детской коляске. Этот прием не помог ранее судимым женщинам. Нанесенный ими ущерб оценивается в 670 тысяч рублей.

Работники торговли признаются, что такого незаконного спроса на школьные рюкзаки не было никогда. Чаще крадут по мелочи, но действуют куда профессиональнее, чем неудачливые любители детских школьных принадлежностей.

ДЗІКУНСТВА!

## Не пашкадаваў ні маці, ні брата-інваліда...

*Каб набываць наркотыкі, мужчына выгнаў з дому родную маці і забіраў мізэрную грашовую дапамогу ў брата-інваліда.*

Адвучыць 29-гадовага мінчука ад наркатычнай залежнасці так і не здолелі ні слёзы маці, ні просьбы малодшага брата, ні нават... семь турэмных тэрмінаў. Упершыню жыхар сталіцы патрапіў за краты ў далікатным узросце — у 15 год сеў за крадзеж. Па гэтым жа артыкуле яго судзілі яшчэ два разы, тры разы ён пападаўся на рабаўніцтве і адзін турэмны тэрмін атрымаў за нанясенне цяжкіх цялесных пашкоджанняў.

Падчас першай адсідкі малады чалавек пачаў ужываць наркотыкі. Страшная звычка разбурыла жыццё не толькі самога мінчаніна, але і ўсёй яго сям'і.

Пасля адбывання чарговага пакарання мужчына выгнаў маці з уласнай кватэры і стварыў у бацькоўскім доме прытон. Жанчына намагалася спыніць дзейнасць сына, бо той пачаў не толькі ўжываць, а таксама самастойна рабіць наркотыкі.

У кватэры з наркаманам самнасам застаўся толькі яго брат-інвалід, які спачатку проста трываў здзекі, а потым яшчэ і пазбавіўся сваёй пенсіі — яе забіраў брат.

Канец бясчынствам паклала міліцыя, затрымаўшы гаспадара прытона.

*"Праваахоўнікі апроч гаспадара заспелі ў кватэры яшчэ каля пяці чалавек,* — паведаміла прэс-афіцэр Партызанскага РУУС **Ганна Чыж-Літаш**. — *Па ўсім жыллі былі раскіданы шпрыцы і бутэлькі з-пад опіуму. Гаспадар кватэры знаходзіўся практычна ў стане поўнай адсутнасці памяці, на працягу ўсяго допыту ў яго доўжылася істэрыка, якая суправаджалася слязьмі і пагрозамі".*

Пакуль сваякі дэспата могуць жыць спакойна — супраць мужчыны ўзбудзілі крымінальную справу за абарот наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў. Яму пагражае да 5 год пазбаўлення волі.

**Марыя МАЛЕВІЧ.**

АДРАС ДЛЯ ГУРМАНАЎ

# Смачнае свята

*На першым фестывалі-конкурсе нацыянальнай кухні, што прайшоў у пансіянаце медыцынскага цэнтра "ЛОДЭ" (пад Лепелем), перамог "Судак пад лісічкамі".*

Што можа быць летам лепей за адпачынак на прыродзе? Скажам, у пансіянаце медыцынскай фірмы "ЛОДЭ".

Знаходзіцца гэты аздараўленчы цэнтр у 160 кіламетрах ад Мінска ў маляўнічых месцах Лепельшчыны. На тэрыторыі пансіяната зараз больш за дваццаць домікаў з экалагічна чыстага дрэва.

Пра папулярнасць гэтага пансіяната яскрава сведчыць такі факт: месцы ў доміках пансіяната "ЛОДЭ" бранiруюцца загадзя. Кошты іх арэнды не высокія. Напрыклад, арэнда трохмясцовага доміка з лядоўняй, тэлевізарам, камінам каштуе 320 тысяч рублёў, у доміках эканом-класа можна пасяліцца за 100 тысяч рублёў у суткі. За трохразовае харчаванне ў пансіянаце трэба даплаціць у дзень усяго 40 тысяч рублёў.

Для пастаяльцаў пансіяната прадугледжаны адпачынак на любы густ: нехта любіць проста прагулкі па лесе — калі ласка, хто аддае перавагу больш актыўнаму адпачынку — таксама няма праблем. На тэрыторыі пансіяната ёсць лазня, унутранае возера для аматараў рыбалкі, футбольнае поле, сталы для гульні ў пін-понг, рыхтуецца адкрыццё кортаў для вялікага тэніса...

"Яшчэ якіх-небудзь восем гадоў таму тут нічога не было — пустое месца, ніхто не верыў, што тут пабудуецца пансіянат і адбою ад турыстаў не будзе, — расказваюць супрацоўнікі. — Аднак дзякуючы намаганням і энтузіязму дырэктара "ЛОДЭ" **Уладзіміра Гарбачова** ў гэтым маляўнічым месцы ўзнікла сапраўдная турыстычная мека".

Пастаяльцы пансіяната, з якімі ўдалося пагутарыць карэспандэнту "Народнай Волі", у адзін голас кажуць, што, прыехаўшы сюды ўпершыню, адразу ж адчуваеш жаданне вярнуцца на наступны год, бо супрацоўнікі пансіяната "ЛОДЭ" не перастаюць здзіўляць адпачываючых.

Вось і сёлета дзякуючы крэатыўнасці каманды "ЛОДЭ" ў пансіянаце было вырашана правесці першы фестываль-конкурс мясцовай кухні.

— Сама ідэя конкурсу ўзнікла дзеля таго, каб унесці разнастайнасць у меню нашага пансіяната, — гаворыць начальнік аддзела турызму ААТ "ЛОДЭ" **Наталля Макей**. —У ходзе рэалізацыі праекта вырашылі зрабіць гэты конкурс сапраўдным святам.







І, трэба сказаць, свята ўдалося! Адзінае патрабаванне да страў, якія былі прапанаваны, — прадукты павінны быць вырашчаны тут жа, на Лепельшчыне.

У конкурснай праграме было больш за 30 страў, прыгатаваных камандай кулінараў пад кіраўніцтвам шэф-повара пансіяната "ЛОДЭ" **Валянціны Судак**. Іх разнастайнасць уражвала. На стале было ўсё: ад смажаных яблык з рызынкамі да заліўнога судака і вэнджанага парасяці, фаршыраванага дарагой па цяперашніх часах грэчкай.

Кампетэнтнаму журы было з чаго выбіраць. Лепельшчына — азёрны край, мо менавіта таму гран-пры атрымала рыбная страва — "Судак пад лісічкамі". Прыз глядацкіх сімпатый атрымала згаданае вышэй "Парася з грэчкай", а журналісцкае журы аддало перавагу страве "з налётам прафесійнасці" — па іх меркаванні, перамог "язык пад шубай" з красамоўнай назвай "Цэнзура". У намінацыі "За адданасць традыцыям" не было роўных класічным беларускім калдунам...

Як паведаміла Наталля Макей, стравы-пераможцы будуць уключаны ў пастаяннае меню пансіяната "ЛОДЭ". Прыязджайце, дэгустуйце!

**Антон КУНКЕВІЧ.**

ТЭМА ДНЯ

# Валютная гарачка

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

*Я паглядзеў сайт Нацбанка, там сказана, што за першае паўгоддзе ажыццявілі падтрымку камерцыйных банкаў на 7 трыльёнаў рублёў. Іншымі словамі, ніякіх высноў не зроблена. Аб'яўлялі, што скароцяць крэдытную экспансію і тэмпы росту грашовай масы ў нацыянальнай валюце... Пакуль гэтага не адбываецца, друкарскі станок па-ранейшаму ўключаны. Я ўсё-такі чакаю здаровага сэнсу, што дзяржава павінна спыніць жарты з абясцэньваннем нацыянальнай валюты, так як гэта дрэнна канчаецца для ўсяго грамадства і для бізнесу".*

А вось што думае пра валютную гарачку ў краіне **Леанід Злотнікаў,** эканаміст, аналітык:

*"Цяперашнія курсы на чорным рынку — не спекулятыўныя. Гэта вынік падзелу курсаў, іх множнасці. Калі частка валюты прадаецца нейкім арганізацыям па нізкім курсе на крытычны імпарт, то другая частка валюты аб'ектыўна будзе каштаваць даражэй раўнаважнага курса. Калі б зараз быў рынкавы курс, то ён, канечне, быў бы не 5000 рублёў за долар. А прыкладна 6500 у свабодным продажы. Але не вышэй. І дакладна не 8000 рублёў. Множнасць курсаў створана штучна. Акрамя таго — дэфіцыт валюты на свабодным рынку. Калі б была рэальная канкурэнцыя, то прадпрыемствы, якія атрымліваюць ад дзяржавы долар па 5000 рублёў, адышлі б у бок і не змаглі змагацца. Яны вымушаны былі б збанкрутавацца. І курс быў бы сярэдні..."*

Спадар Злотнікаў лічыць, што з улікам крэдытаў можа скласціся так, што адзіны курс можа ўсталявацца на адзнацы 6000—6500 рублёў за долар. Але толькі на якія 2—3 месяцы...

Пагаджаючыся ў многім з поглядамі на фінансава-эканамічную праблему, якая склалася ў краіне, з Багданкевічам і Злотнікавым, тым не менш эканаміст і аналітык **А.Муха** мае сваё ўяўленне пра сітуацыю і рэцэпты выздараўлення валютнага рынку і эканомікі ў цэлым. *"Я з'яўляюся балельшчыкам нацыянальнай грашовай адзінкі,* — кажа ён. — *Трэба вярнуць давер да нацыянальнай грашовай адзінкі, правесці вялікую работу па дэдаларызацыі эканомікі. Патрабуецца нямала высілкаў і часу, але гэта не азначае, што такую працу не трэба праводзіць. Пацыху трэба навучыцца працаваць у гэтым кірунку. Няхай нават з прымяненнем непапулярных мер"*. А вось калі ўжо краіна выйдзе на адзіны абменны курс, можна будзе вырашаць і доўгатэрміновыя задачы... Пры гэтым спадар Муха не выключае, што пойдзе на карысць і такая непапулярная мера, як абмежаванне заработных плат.

Можа быць, і так. Можа, многія канкрэтныя прапановы эканаміста і маюць пад сабою здаровы сэнс і цвёрды грунт, але, мусіць, цяжка будзе пагадзіцца з тым жа скарачэннем зарплат сотням тысяч людзей, якія і так зарабляюць мізэр. Нават уявіць такое немагчыма, бо і без скарачэння заробкаў народ на мяжы жабрацтва.

**Георгій ПЛАТОНАЎ.**

Народная Воля
http://www.nv-online.info
23 ЖНІЎНЯ 2011 г.

ДИПЛОМАТИЧЕСКИЙ КЛУБ

*Александр СОСЮРА, Временный Поверенный в делах Украины в Беларуси:*

# «Приоритет Украины — это европейская интеграция...»

*24 августа 2011 года Украина отмечает 20-ю годовщину независимости. Накануне юбилейной даты Временный Поверенный в делах Украины в Беларуси Александр СОСЮРА предложил рассказать нашим читателям о том, как живут сегодня украинцы.* ***“Мне кажется, что некоторые белорусские СМИ в последнее время тенденциозно преподносят новости из Украины, без объективной составляющей. А по белорусской тематике подобным грешат и украинские журналисты. В итоге население наших стран очень слабо информировано о позитивном опыте друг друга”,*** *— заметил при встрече дипломат.*

**— Какие СМИ Украины — государственные или независимые — выставляют Беларусь в невыгодном свете? В Беларуси, как вы знаете, негосударственного телевидения нет. Поэтому можно предположить, кто заинтересован в новостях, рассказывающих о том, как плохо живется в вашей стране.**

— В Украине только одна государственная телерадиокомпания, которую представляет канал УТ-1, все остальное телевидение — негосударственное. Необходимо отметить, что наше телевидение если и показывает материалы, посвященные Беларуси или украинско-белорусским отношениям, то крайне редко они носят негативный характер, подаются с отрицательными эмоциями. На Белорусском же телевидении, к сожалению, мы довольно часто встречаем сюжеты об Украине со знаком минус. Не знаю, чем это можно обяснить, но факт остается фактом.

В Украине новостные передачи разных каналов имеют похожие задачи, работают на аудиторию, на рейтинг, повышение привлекательности рекламных блоков. Новость должна цеплять, быть интересной, даже скандальной. Но я считаю, что и белорусскому, и украинскому зрителю было бы интересно находить в СМИ больше позитивной информации о наших странах.

**— Какой информации об Украине, на ваш взгляд, не хватает в белорусских масс-медиа?**

— Мне кажется, что во многих случаях в белорусских теленовостях Украину показывают необъективно, возможно, специально выбираются такие темы и ракурсы для сравнения, в смысле *“а у них хуже, чем у нас”.* Возможно, с идеологической точки зрения Беларуси это нужно. Но с позиции добрососедства, на мой взгляд, это неправильно, надо искать позитив друг у друга и учиться на достижениях соседей, показывать то, что можно перенять.

**— Что, в Украине действительно живется хуже, чем в Беларуси, как это показывают?**

— Нет, конечно. В Украине, как и в каждой стране, существуют свои сложности и нерешенные проблемы. Но постоянно идет процесс поиска путей их решения. За многие столетия борьбы за независимость мы, наконец, строим свое, украинское, государство, и 20 лет наша страна развивается самостоятельно. За это время сделано очень много шагов по становлению государственности, нарабатывалась законодательная база, но мы же понимаем, что в других государствах, в европейских демократиях все эти вещи нарабатывали столетиями. Поэтому нельзя сказать, что сегодня в Украине все хорошо, все идеально. Наоборот — проблем достаточно. Но и позитива очень много. Один из таких моментов состоит в том, что все время идет открытый для общества поиск оптимальных решений, для того чтобы и государство, и общество динамично развивались, создавая максимально комфортные условия для жизни всех категорий населения.

**— Например, в Беларуси любят говорить, что Украина не смогла сохранить колхозы и там сегодня, образно говоря, земли не пашутся и коровы не доятся. Подобные проблемы действительно существуют или решение отдать землю в частные руки было правильным?**

— Я вижу и позитивные, и негативные моменты в этом решении. Но если мы достигнем конечной цели реформирования земельных отношений — рынка земли, это будет хорошим импульсом к вливанию инвестиций в сельское хозяйство и обеспечению его дальнейшего активного развития.

Кстати, по прогнозам урожай зерна в Украине в 2011 году составит более 46 миллионов тонн, что позволит стране экспортировать свыше 22 миллионов тонн в сезоне 2011/12 годов.

Уже сегодня Украина полностью обеспечивает себя мясом птицы. Аналогичный путь проходит отрасль свиноводства, выращивания крупного рогатого скота...

В свою очередь мы позитивно оцениваем то, что удалось сделать в сельском хозяйстве Беларуси, обеспечив существенный рост объемов производства сельхозпродукции. Но какой механизм ведения агробизнеса в будущем окажется более конкурентоспособным, более эффективным — тот, который избрала Украина, или вариант Беларуси, покажет время.

**— Если сравнить полки продуктовых магазинов в Украине и Беларуси — сильно они отличаются по ассортименту и ценам?**

— Сегодня, когда Беларусь переживает валютный кризис, наверное, отличаются сильно — у вас заметно снизился ассортимент по импорту, в магазинах и на рынках появилось много пустых прилавков.

Что касается отечественного товара, то, наверное, ситуация в Украине немного лучше. У нас много известных торговых марок - “Торчин”, “Верес”, “Рошен”, “Чумак”, “Сандора” и другие, которые широко известны за пределами Украины и которые сегодня обеспечивают производство продукции европейского уровня. Что важно — эти компании постоянно вкладывают большие ресурсы в модернизацию, в расширение производства, улучшение качества, ассортимента и рынков сбыта.

При этом украинцы очень ценят качество белорусских продуктов. У нас знают “Савушкин продукт”, “Санта Бремор”, белорусское сливочное масло и сгущенное молоко заслуженно пользуются устойчивым спросом среди потребителей.

**— Александр Васильевич, а какая сегодня в вашей стране средняя заработная плата, пенсия?**

— На конец первого полугодия 2011 года средняя заработная плата составила около 350 долларов. Но она отличается по регионам. В сельскохозяйственных регионах она несколько ниже, около 220—250 долларов, в Киеве — больше 500 долларов.

Что касается трудовой пенсии по возрасту, то ее средний размер может колебаться в пределах 140—150 долларов, минимальный — 95 долларов. В Украине уже работает персонифицированный учет отчислений в пенсионный фонд с перспективой, что на определенном этапе будет сделан переход к накопительной системе. Сейчас пенсионная система Украины переживает период реформирования, и в государстве идет серьезная дискуссия о путях усовершенствования законодательной базы пенсионного обеспечения в условиях ухудшения демографической ситуации в стране.

**— У белорусов практически не осталось льгот. А в Украине?**

— На протяжении 15 лет в сфере социальной защиты населения вырабатываются механизмы персонификации социальной поддержки, т.е. при получении льгот учитывается социальное положение, уровень материального состояния. Это позволило приблизить государственную поддержку к тем категориям граждан, которые в ней нуждаются: малообеспеченным, нетрудоспособным, инвалидам, многодетным семьям и другим. В то же время сохраняются льготы для определенных категорий населения: пенсионеров, инвалидов, участников войны и боевых действий, детей войны. Сохранен бесплатный проезд в транспорте для пенсионеров и 50-процентные скидки от стоимости билетов для студентов.

**— В своем последнем интервью “Народной Воле” экс-посол Украины в Беларуси Роман Безсмертный заметил, что за 20 лет в вашей стране сменилось четыре президента. “В этом отношении украинцам можно позавидовать”, — высказывал свое мнение Безсмертный. Но новый президент — это ведь не только новое лицо власти, это и новая система управления. Сильно ли изменилась жизнь рядовых украинцев с приходом к власти Виктора Януковича?**



— Четвертый президент Украины Виктор Янукович еще не так долго занимает свой пост. Давать оценки его деятельности пока рано. Но при этом уже определены приоритеты развития страны и задачи органов государственной власти по их реализации.

Идет постоянный процесс развития и структур государственной власти, и общества, и бизнеса.

Нельзя также не сказать о том, что практически все бывшие президенты Украины на протяжении своих каденций корректировали свои программы, взгляды, подходы к решению проблем, и большую роль в этом играло само общество, средства массовой информации, позиция граждан страны. Мне кажется, если общество зрелое, оно путем проб и ошибок выбирает оптимальный путь, куда двигаться и как двигаться. Украинский народ все 20 лет активно включен в жизнь своей страны. Например, у нас по пятницам в вечерних эфирах разных телеканалов очень много политических ток-шоу в прямом эфире, в которых как непосредственно в студиях, так и у экранов телевизоров до поздней ночи участвуют наши люди. Многие дипломаты, работающие в Украине, даже удивляются такой политической активности украинцев и говорят: в Европе в конце недели у телевизора собираются, чтобы отдохнуть, посмотреть развлекательные программы, а у вас — политические ток-шоу...

Что касается системы управления... Новая команда изменила подходы к формированию вертикали власти. Идет ее усиление. Наверное, на определенных этапах она была больше, чем нужно, либерализована. Идет реформирование государственного аппарата управления, существенные сокращения происходят в структуре управления. Очень большой акцент поставлен на борьбе с коррупцией, ликвидации коррупционных связок бизнес—власть. Результаты этой работы можно будет ощутить спустя какое-то время. Оценивать надо не процесс, а результат.

**— Можно ли говорить, что в Украине преследуются сторонники прежней власти, оппоненты нынешнего руководителя страны? Например, Юлия Тимошенко заявляет, что ее уголовное дело — это месть Виктора Януковича за Майдан.**

— На мой взгляд, сегодня нельзя оценивать этот судебный процесс в такой плоскости. В истории независимой Украины впервые в отношении госуправленца такого уровня происходит судебное разбирательство. Но хорошо то, что этот судебный процесс происходит открыто, за ним следит вся Украина, он имеет большой резонанс в мире. На мой взгляд, нет лучшего пути, чем провести судебное заседание, услышать мнение и аргументы всех сторон и дать возможность суду принять обоснованное, аргументированное решение.

**— Насколько в Украине независимый суд? Как происходит назначение судей?**

— Решение по утверждению судей принимает Верховная Рада, по отдельным кандидатурам — и президент Украины.

Понятно, что в каждом социуме большую часть составляют честные, порядочные люди, которые при выполнении служебных обязанностей никогда не задумываются над тем, как что-то сделать с выгодой для себя, но встречаются и те, которые ничего не делают без такой выгоды. Такое положение дел и в украинской судебной системе. Но дело Тимошенко настолько резонансное и находится под таким пристальным вниманием общественности, что на судьях лежит двойная, тройная ответственность...

Думаю, что этот процесс в свою очередь послужит толчком к дальнейшему совершенствованию судебной системы Украины.

## Средний украинец более самостоятельный, активный, прагматичный

**— Каковы сегодня приоритеты внешней политики Украины?**

— Если говорить об обеспечении национальных интересов и о политике безопасности, то наш основной приоритет — это европейская интеграция. МИД Украины усиленно работает над Договором об ассоциации с Европейским Союзом, в рамках которой предусматривается положение о зоне свободной торговли с ЕС.

В то же время мы пытаемся найти пути сотрудничества и с Таможенным союзом.

**— К слову, Украина еще не добилась безвизового режима с ЕС?**

— В свое время руководством Украины было принято политическое решение о введении безвизового режима для граждан ЕС: до 90 дней они могут пребывать в нашей стране, не имея визы. Украинцы же пока без визы в Европу поехать не могут. Но, например, шенгенская виза для граждан Украины стоит 35 евро. Кроме того, в рамках договора об ассоциированном членстве Украины в Евросоюзе рассматривается и соглашение о безвизовом режиме поездок в страны Евросоюза для украинцев.

**— Не могу не спросить о двусторонних белорусско-украинских отношениях: на ваш взгляд, в последнее время они забуксовали или, наоборот, активизировались?**

— Сложно оценивать... Мне кажется, сейчас идет этап реализации тех наработок, которые были сделаны на всех уровнях контактов двух стран. Стабильно работает двусторонняя межгосударственная комиссия. Но, безусловно, существуют вопросы, для завершения решения которых необходимы дальнейшие контакты, в том числе на высшем уровне. Это и финансовые вопросы, которые еще остались со времен Советского Союза, и вопросы границы и т.д.

**— А на каком уровне находятся торгово-экономические отношения Украины и Беларуси?**

— Они развиваются очень динамично. В этом году мы возобновим и, возможно, превысим уровень, который был достигнут до кризисного 2008 года. За первое полугодие 2011 года объем товарооборота уже составил 2 миллиарда 700 миллионов долларов. Это на 50 процентов больше аналогичного показателя прошлого года.

**— То, что Беларусь стала членом Таможенного союза, а Украина вступила в ВТО, не снизит эти обороты?**

— Безусловно, потребуются некоторые механизмы, которые должны будут отрегулировать двусторонние экономические отношения в этих условиях. Над этим сейчас работают обе стороны.

**— Александр Васильевич, вы уже около года работаете в нашей стране. Какое самое яркое наблюдение?**

— То, как изменились за 20 лет украинцы и белорусы. Сегодня средний украинец, особенно младшее поколение, более самостоятелен, активен, прагматичен, он сам, без оглядки на государство решает, как ему жить. Мне кажется, если белорусу и украинцу поставить одну и ту же задачу, механизм ее решения они выберут разный: украинец сразу будет пытаться найти варианты решения, исходя прежде всего из своих умений и возможностей, а белорус будет пытаться сначала узнать позицию государства и лишь потом искать решение. Очень хорошо, когда государство обеспечивает высокие социальные стандарты. Но опасно, если в условиях мирового экономического кризиса планка этих стандартов будет снижаться, а самостоятельно о себе беспокоиться человек не умеет.

Такая разница в подходах, мне кажется, сформировалась вследствие того, что в Украине очень активно развивается частный сектор, он значительно превалирует над государственным. В Беларуси же ситуация противоположная.

## Наши дети уже другие, они ощущают себя украинцами

**— Вернемся к тому, что поводом для интервью стало 20-летие независимости Украины. На протяжении беседы вы все время повторяете, что 20 лет независимости Украины — это 20 лет поиска. Но за эти годы были завоевания, которыми может гордиться Украина? На ваш взгляд, чего было больше — удач или поражений?**

— Безусловно, удачи есть. Самое главное завоевание — наши дети уже другие. Они не знают, что такое Советский Союз, запрет, страх. Не понимают, как можно критиковать власть только шепотом на кухнях. Они по-другому относятся к государству и своей роли в нем, они ощущают себя украинцами. За ними будущее независимой Украины, которую они будут любить и беречь.

**— Как пройдут торжества по случаю 20-летия независимости? В этом году впервые в Украине День независимости решено провести без военного парада. Он, согласно распоряжению Виктора Януковича, будет отменен. Как украинский народ воспринял такое решение президента? В Беларуси, например, несмотря на кризис, от военного парада не отказались...**

— Нормально воспринял, потому что все понимают: Украина после кризиса переживает не самый лучший период. И думаю, что хуже украинцы восприняли бы решение проводить военный парад, потому что всем понятно, насколько это дорогостоящее мероприятие и лучше эти средства потратить на другие цели.

А мероприятий, которые приукрасят праздник, будет достаточно — это и фейерверки, разного рода праздничные вечера, концерты, выставки. Спектр самый широкий, местные власти будут искать те формы организации, которые позволят населению ощутить, что страна отмечает юбилей — 20 лет независимости! Кроме того, в Киеве состоится Всемирный съезд украинцев, в котором примут участие делегации украинцев со всего мира.

**— И последний вопрос. Уже известно, кто будет послом Украины в Беларуси? Когда он приедет в Минск?**

— Когда был уволен Роман Петрович Безсмертный, в средствах массовой информации уже была озвучена фамилия возможного кандидата. В этом направлении все и движется...

**Мария ЭЙСМОНТ.**

## *Беларусы супраць уваходу ў склад Расіі*

Апошнім часам паменшылася колькасць беларусаў, якія падтрымліваюць ідэю Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.

Пра гэта паведаміў дырэктар Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук, доктар сацыялагічных навук **Ігар Катляроў**.

Паводле яго слоў, як сведчаць вынікі сацыялагічнага маніторынгу, сёння 52% жыхароў краіны лічаць, што Беларусь і Расія павінны быць абсалютна незалежнымі дзяржавамі, жыць па міжнародных дагаворах. 40% беларусаў лічаць, што Беларусь і Расія павінны актыўна развіваць Саюзную дзяржаву. Для параўнання: 10 гадоў таму ў падтрымку Саюзнай дзяржавы выказваліся 80% беларусаў.

Толькі крыху больш за 2% беларусаў сёння лічаць, што Беларусь павінна ўвайсці ў склад Расійскай Федэрацыі як рэгіён.

## *Чарніц прадалі на... 5,4 мільёна долараў*

Пра гэта паведаміла начальнік упраўлення нарыхтовак Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў **Аксана СКІНДАР**. Паводле яе слоў, экспартная цана чарніц расце. Калі ў пачатку пастаўкі ягада каштавала 3 еўра за кілаграм, то ў далейшым чакаецца рост цэн да 3,9—4 еўра за кілаграм.

Дарэчы, сёлета ў насельніцтва было закуплена 3,6 тысячы тон чарніц. За іх здачу было выплачана 60 млрд рублёў. Чарніцы закупляліся па цане ад 10 тысяч рублёў за кілаграм у пачатку сезона нарыхтовак да 26—26,8 тысячы — у канцы.

ЧУЛІ?

## *Ужо не сувораўцы, але кадэты...*

*З 1 верасня ў Гродне расчыніць дзверы новая навучальная ўстанова для падлеткаў — абласное вучылішча кадэтаў.*

Навучанне ў кадэцкім вучылішчы будзе адрозніваецца ад навучання ва ўжо існуючых у Гродне кадэцкіх класаў. Па словах начальніка аддзела адукацыі адміністрацыі Ленінскага раёна **Сяргея Памекі**, акрамя базавай і агульнай адукацыі кадэты змогуць атрымаць неабходныя для выбару прафесіі першасныя веды і навыкі ваеннай справы, службы ў органах унутраных спраў і падраздзяленнях па надзвычайных сітуацыях. На 2011/2012 навучальны год набіраюць 8-ы і 9-ы класы, у якіх будзе прыкладна 100 чалавек.

Заняткамі па ваеннай справе, фізпадрыхтоўкай і ўсім астатнім, што прадугледжвае кадэцкі статут, падлеткі будуць займацца ў другой палове дня. Кадэты падчас знаходжання ў кадэцкім вучылішчы (будынак сярэдняй школы №22) забяспечваюцца бясплатным чатырохразовым гарачым харчаваннем, а іншагароднія будуць знаходзіцца ў сценах вучылішча кругласутачна.

Да 27 жніўня будзе закончаны першы набор кадэтаў. Прыём ажыццяўляецца на конкурснай аснове ў выніку экзаменацыйных іспытаў і па выніках псіхалагічнага адбору і медыцынскага агляду.

Работа кадэцкага вучылішча будзе арганізавана ў адпаведнасці з палажэннямі Указа А. Лукашэнкі аб кадэцкім вучылішчы ад 28.01.2010 №54. Варта нагадаць, што на Беларусі гэта не першая і, відаць, не апошняя навучальная ўстанова такога ўзору. Летась у Слуцку, напрыклад, таксама з’явіліся свае кадэты. А пачатак прыдумцы быў пакладзены ў Расіі, калі ў 1732 годзе генерал-фельдмаршал Мініх прадставіў на зацвярджэнне імператрыцы Ганны Іаанаўны план стварэння першага ваенна-навучальнага Корпуса кадэтаў. Навучэнцы корпуса насілі ваенную форму і праходзілі страявую падрыхтоўку. У 1743 годзе была праведзена першая рэарганізацыя ваенна-навучальных устаноў: Школа навігацкіх мастацтваў (тварэнне Пятра І) была перайменавана ў Марскі корпус, а Мініхаўскі корпус — у Сухапутны шляхецкі кадэцкі корпус. Пры Кацярыне ІІ вырашана было даць у сухапутных карпусах спецыялізацыю па родах зброі. Заснавалі артылерыйскі і інжынерны карпусы. Пры Аляксандру І кадэцкія карпусы з’явіліся за межамі Пецярбурга: спачатку ў Шклове (пасля яго перавялі ў Маскву), затым у Омску, Арэнбургу, Гельсінгфорсе, Ніжнім Ноўгарадзе. Цікава, што ў 1831 годзе ў сувязі з тым, што многія выпускнікі і навучэнцы Калішскага корпуса прынялі ўдзел у польска-беларускім паўстанні на баку інсургентаў, гэты кадэцкі корпус быў ліквідаваны.

І вось старая прыдумка на новы лад: на Беларусі ледзь не штогод з’яўляюцца свае ўжо кадэты. Хай сабе, абы не сувораўцы...

**Георгій ПЛАТОНАЎ.**

## *Замест «зайцоў» — пральныя машыны і халадзільнікі*

У студзені—ліпені 2011 года беларусы набылі нехарчовых тавараў на 5 трыльёнаў 526 мільярдаў рублёў. Самым вялікім попытам у насельніцтва карысталіся пральныя машыны і халадзільнікі.

Як паведамілі БелаПАН у Галоўным статыстычным упраўленні Мінска, у натуральным выражэнні рост продажу пральных машын у параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года склаў 67,5% (прададзена 20,2 тыс. штук), халадзільнікаў і маразільнікаў — 49,6% (31,5 тыс. штук), каляровых тэлевізараў — 9,8% (25,7 тыс. штук).

## *Дзеці засведчаць...*

У Беларусі рыхтуецца законапраект, які прадугледжвае шэраг працэсуальных правоў для дзяцей на судовых пасяджэннях па грамадзянскіх справах.

У прыватнасці, плануецца ўнесці адпаведныя змены, якія дазволяць дзецям малодшым за 14 гадоў выступаць падчас любога судовага або адміністрацыйнага разбору, які закранае дзіця. Пакуль што ў Беларусі такое права дзеці могуць рэалізаваць падчас разгляду крымінальных спраў. На грамадзянскіх працэсах дзіця можа выступаць з 9 гадоў, але толькі калі гэта звязана з разводам бацькоў.

Калі гэтае права непаўналетніх пашырыцца, то яны змогуць выступаць на працэсах, якія, напрыклад, звязаны з правам на здзелку або спадчыну, а таксама іншымі маёмаснымі пытаннямі. Аднак на практыцы гэта будзе азначаць, што ўзроставы парог для кожнага дзіцяці будзе вызначацца індывідуальна.

РАЗВІТАННЕ

# Ён ганарыўся гісторыяй Беларусі

*На 64-м годзе жыцця памёр Віталь СКАЛАБАН.*



Віталь Скалабан нарадзіўся ў 1947 годзе ў вёсцы Шылавічы Слонімскага раёна. У 1970 годзе ён скончыў Ленінградскі ўніверсітэт. З 1972 года працаваў рэдактарам у выдавецтве “Беларуская Энцыклапедыя”. Пазней атрымаў пасаду загадчыка рэдакцыі.

Дасягненні і адкрыцці Скалабана знаёмыя беларусам са школьнай лаўкі. Менавіта ён выявіў, хто напісаў паэму “Тарас на Парнасе”.

*“Яшчэ ў 1986 годзе мне ўдалося знайсці копію рукапісаў Рэпінскага, дзе было пазначана аўтарства “Тараса на Парнасе”, і з яе дапамогай вызначыць імя аўтара паэмы,* — распавядаў гісторык у інтэрв’ю “Народнай Волі”. — *Сёння нават у школьных падручніках ужо не гаворыцца, што “Тарас на Парнасе” — твор ананімны. Яшчэ больш, вядомы дата і месца напісання паэмы: 15 красавіка 1855 года, мястэчка Гарадок*”.

Скалабан стаяў ля вытокаў стварэння найлепшых беларускіх энцыклапедый, напрыклад “Энцыклапедыі гісторыі Беларусі”. Акрамя таго, гісторык друкаваўся ў газетах і часопісах, пісаў п’есы. Віталь Уладзіміравіч прызнаўся калісьці, што быў бы вельмі рад, калі б п’есу “Людвіка і Фабіян”, якую ён стварыў у сааўтарстве з **Людмілай Рублеўскай**, паставіў Слонімскі драматычны тэатр.

Пры ўсім гэтым ён так і не абараніў доктарскую, хаця зрабіў вялікі ўнёсак у развіццё сучаснай гістарычнай навукі. У тым ліку спадар Скалабан выявіў шмат цікавых фактаў з жыцця знакамітых беларусаў. Гісторык не аднойчы прызнаваўся, што найбольш цікавіцца такімі асобамі, як **Доўнар-Запольскі, Улашчык, Янка Купала, Гарэцкі, Ігнатоўскі, Платонаў**. Займаўся даследаваннямі беларускага нацыянальнага руху, культуры XIX—XX стагоддзяў, пытаннямі гістарыяграфіі, архівазнаўства, краязнаўства і бібліяграфіі.

З 2002 года быў навуковым супрацоўнікам Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Спадар Скалабан заўжды казаў, што ганарыцца гісторыяй свайго краю, ён дапамагаў людзям адчуць сувязь з мінулым, вучыў паважаць сваю радзіму і рабіць усё магчымае для яе славы.

*“Некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што ў нас загінулі архівы, бібліятэкі, каштоўныя дакументы і гэтак далей, —* разважаў Скалабан. — *Ды не. Мы не такія бедныя, як нам часам хочацца. У нас у Беларусі даволі багатыя архівы. І беларускіх збораў вельмі шмат па-за межамі Беларусі ў многіх краінах свету. Трэба не спаць, а шукаць гэтыя дакументы і вяртаць іх на Бацькаўшчыну”*.

Развітанне з Віталем Скалабанам пачнецца сёння а 13-й гадзіне ў зале рытуальных паслуг пры 9-й Клінічнай бальніцы Мінска (вул. Сямашкі, 8). Пахаваны гісторык будзе на Паўночных могілках.

Рэдакцыя “Народнай Волі” выказвае глыбокае спачуванне родным навукоўца.

**Марыя МАЛЕВІЧ.**

Народная Воля
http://www.nv-online.info
23 ЖНІЎНЯ 2011 г.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ

## *Калі ўлада ў нас такая, што ж наперадзе чакае?*

**Савет міністраў падрыхтаваў змены ў Закон "Аб масавых мерапрыемствах". Цяпер дазвол будзе патрэбны не толькі на пікеты і дэманстрацыі, але нават на маўчанне. Напрыклад, Саўмін прапануе атрымліваць дазвол "на масавую прысутнасць грамадзян у загадзя вызначаным грамадскім месцы (у тым ліку пад адкрытым небам) і ў пэўны час для здзяйснення загадзя вызначаных дзеянняў ці бяздзеяння".**

*І Палата дэпутатаў
Прыняла такі Закон!
Не хапае зараз кратаў,
Каб загнаць за іх мільён
Непакоранага люду,
Абывацеляў з гурмы:
І паэта, і аблуду
Гвалтам цягнуць да турмы.
Люд не знае, ў чым правіна
І за што такі прыгнёт.
Анямела ўся краіна,
Страх апанаваў народ.
...На аўтобусным прыпынку
Шмат сабралася людзей.
Пэўна ж, гэткую карцінку
Кожны бачыць што ні дзень,
Бо аўтобусы, трамваі
"Ходзяць" тут гады ў рады.
Не раве натоўп, трывае,
Каб не мець затым бяды.
Ды аўтобуса заместа
Пад'язджае аўтазак.
Месяць люд няўцямны ў цеста,
Пруць у турмы небарак.
...Ля гарэлачнае крамы
Утварылася чарга:
Быў Вялікдзень — дзень той самы,
Калі выпіць трохі льга.
Бамжаваты люд і чынны
(Зрэшты, як ва ўсе часы):
І пры гальштуках мужчыны,
І "сінюшныя насы".
Затаварыўшыся "гарай",
Разышліся б людзі, каб
Ваяўнічай чорнай хмарай
Не накінуўся АМАП.
— Што за зборня? Што за сходка?
Парушаеце Закон! —
Зараўла маёра глотка
І дала загад на "шмон".
Тых, што гальштукі насілі,
Аўтазак чакаў.
Таго,
Хто стаяў тут з носам сінім,
Гналі прэч пад зад нагой.
...Год працоўны на зыходзе,
Калектыўны кліч узнік:
— А чаму б жа на прыродзе
Не наладзіць нам пікнік?
Кліч гурма ўся падхапіла —
І жанкі, і мужыкі.
Год праводзілі пад піва,
Пад віно і шашлыкі.
Песні аж да зор шугалі,
Мірна гутаркі цяклі...
І калі яшчэ ў мангале
Не сатлелі вугалі,
Да вясёлае паляны
Падкаціўся аўтазак.
— Мне няважна, хто тут п'яны, —
Ім маёр сказаў вось так. —
Важна, што вы тут у кучы.
А ці маеце дазвол?
Лёс ваш цяжкі, немінучы —
Я складаю пратакол!
Сустракаў у каталажцы
Калектыў той Новы год.
З тых часоў пітво, што ў пляшцы,
Людзям больш не лезе ў рот...*

* * *

*Калі ўлада ў нас такая
І Закон загнаў у кут,
Што ж наперадзе чакае
Беларускі просты люд?
У гурме — не больш як трое,
Каб не ўзнік натоўп нідзе.
А хадзіць мы будзем строем
Ці як быдла ў чарадзе.
Потым розум закарэ,
Іскры згаснуць у вачах...
Да Паўночнае Карэі
Беларусь трымае шлях!*

АДКРЫТЫМ ТЭКСТАМ

# Крывое люстэрка

*Усе 17 год свайго панавання ў Беларусі рэжым Лукашэнкі робіць усё, каб адбіць жаданне ў беларусаў займацца актыўнай грамадскай, а тым больш палітычнай дзейнасцю. Для выканання гэтай задачы ўладныя цэрберы з карных органаў маюць даволі шырокі набор сродкаў: выключэнне з навучальных устаноў, звальненне з працы, затрыманні,ператрусы, арышты, крымінальныя справы... І, як сведчыць практыка, пад уціск і пераслед трапляюць адукаваныя, выхаваныя і прыстойныя грамадзяне краіны. Такія, як Алесь Бяляцкі.*

У цывілізаваных дэмакратычных краінах праваабаронцы адыгрываюць значную ролю ва ўсіх сферах жыцця грамадства. Іх запрашаюць для кансультацый у парламент пры распрацоўцы законаў, а ва ўрадах шматлікіх краін нават існуе пасада ўпаўнаважанага па правах чалавека. А іначай і быць не павінна, бо пабудаваць сапраўды квітнеючую і паспяховую ва ўсіх адносінах дзяржаву можа толькі разняволены, ініцыятыўны грамадзянін, які ведае свае правы і можа іх абараніць, у тым ліку і з дапамогай праваабарончых арганізацый. У Беларусі ж складваецца сітуацыя, як у крывым люстэрку — з дакладнасцю да наадварот.

І прыклад з Алесем Бяляцкім, якога кінулі за краты менавіта за грамадскую дзейнасць, яскравае таму пацвярджэнне. Створаны Бяляцкім праваабарончы цэнтр "Вясна" за гады свайго існавання дапамог тысячам і тысячам беларусаў. Каму проста скласці заяву ў пракуратуру ці суд, а каму і трэба было наняць адваката, вырашыць пытанні з дзяржпошлінай, штрафамі і многае-многае іншае. Дзейнасць Алеся Бяляцкага і яго калег з "Вясны" — гэта не толькі прыклад самаахвярнага змагання і служэння Закону і Канстытуцыі, аб якія ўлада вось ужо каторы год проста выцірае ногі, але і варты для пераймання прыклад беларускасці, чаго так не хапае многім нашым грамадскім дэмакратычным арганізацыям.



Алесь Бяляцкі (справа) на адной з акцый пратэсту ў Мінску.

Абвінавачванне ж Бяляцкага з боку карных органаў ва ўтойванні даходаў і нявыплаце падаткаў настолькі абсурдныя і хлуслівыя, што абмяркоўваць іх проста няма сэнсу. Па-першае, адразу паўстае пытанне: чаму ўлады пазбавілі праваабарончы цэнтр "Вясна" рэгістрацыі? Па-другое, калі няма рэгістрацыі, то як у Беларусі адкрыць рахунак? Па-трэцяе, грошы донараў выкарыстоўваліся для падтрымкі тых, чые правы былі парушаны тымі ж беларускімі ўладамі. А тое, што Алесь Бяляцкі за праваабарончую працу меў пэўны заробак, — гэта ж абсалютна нармальна.

Хацелася б заўважыць: да прыбыткаў чыноўнікаў розных рангаў такой пільнасці, як да дзейнасці "Вясны", беларускія падаткавікі чамусьці не выяўляюць. Хоць у кожным раённым цэнтры, не кажучы ўжо пра знакамітыя "Драздам", даўно ўжо павырасталі "царскія сёлы" і "бульвары бедных". Там жыве, як кажуць у народзе, мясцовая "знаць" — дырэктары дзяржпрадпрыемстваў, начальнікі і кіраўнікі ўстаноў. Вось бы і спыталі ў гэтых "таварышаў" — адкуль грошы на 2-3-павярховыя катэджы, іншамаркі і навучанне дзяцей за мяжой? Але ж не пытаюць, а наадварот — пакрываюць!

Бо ў тым і сутнасць беларускіх сілавых структур, што служаць яны не Закону, а аднаму чалавеку, які лічыць сябе гаспадаром і ўладаром над жыццямі мільёнаў і які можа не толькі памілаваць чалавека, які трапіў за краты, але і новую пасаду яму даць. Як адбылося, напрыклад, з сённяшнім дырэктарам МАЗа.

Таму ўсёй дэмакратычнай грамадзе трэба прыкласці максімум намаганняў, каб падтрымаць Алеся Бяляцкага, а таксама зафіксаваць на будучае ўсіх тых, хто прымаў, прымае ці прыме ўдзел у гэтай бруднай справе: следчых, пракурораў, суддзяў і гэтак далей. Суд гісторыі немінучы.

**Дзяніс РАБЯНОК, грамадскі актывіст.**

*г.Калінкавічы.*

ГЛЫБІНКА

## *Каб на смак не забыцца...*

У магазіне на ўскраіне Дзятлава сабралася невялікая чарга: якраз прывезлі хлеб, і прадавец была занята. Першым ад прылаўка стаяў дзядок гадоў за восемдзясят. У адной руцэ трымаў цэлафанавы пакет, у другой — кашалёк.

— Што будзеш купляць, Васіль? — пацікавілася знаёмая бабулька.

Не так ёй трэба было ведаць пра тую пакупку, як сумна стаяць і маўчаць.

— Ды вось да каўбас дарагіх прыцэньваюся. Во цэны растуць, каб на іх халера! — хутчэй па прывычцы, чым са злосцю лаецца дзядок. — Трыццаць пяць тысяч, трыццаць сем, сорак пяць тысяч рублёў за кілаграм. Здурнець можна!

— Ну, і якую ж ты выбраў? — усміхаецца кабета, бо добра ведае, што дзядок атрымлівае крыху больш за пяцьсот тысяч рублёў пенсіі, і на такія грошы, вядома, каўбас не накупляеш.

— А вось гэтую вазьму, за сорак пяць тысяч.

— Хіба?! — здзівілася субяседніца.

— Вось табе і хіба. Усяго сто грамаў куплю.

— Ну і што, наясіся?

— Не, канешне. Проста, каб на смак не забыцца, — кажа ёй на гэта дзядок.

## *Для вас, таўстухі!*

У другім магазіне ў цэнтры гарадка дзве мажныя кабеты прыглядаюцца да вітрыны, дзе стаіць малако. Абмяркоўваюць цэны, раяцца, што лепш узяць: брэсцкае малако, слонімскае ці лідскае, або, можа, навагрудскае? Адной падабаецца тое, другой іншае. У Дзятлаве цяпер хоць і ёсць свой завод, малака не фасуюць, бо закрылі лінію, так што купляем прывазное.

У магазін заходзіць чалавек сярэдняга ўзросту, што называецца, пад добрым градусам. Ён таксама ўтаропіўся ў вітрыну, дзе стаіць малако. Потым з захапленнем ускліквае:

— О, таўстухі, спецыяльна для вас разумныя людзі новае малако вынайшлі!

— Што ты тут вярзеш, апоек? Чаму гэта спецыяльна для нас?

— Я ведаю, што кажу, — са з'едлівай усмешкай на пакамечаным твары мовіць мужчына. — Паглядзіце на этыкетку вось на гэтай бутэльцы. Што напісана? Масавая доля тлустасці 0,5 працэнта. І ніякіх дыет не трэба. Будзеце піць такое малако, станеце стройныя, нібы горныя козачкі.

— Глянь, Маня, і праўда, усяго паўпрацэнта тлустасці, — здзіўлена пацвярджае адна кабета другой.

— Хіба што проста флягу папаласкалі і па бутэльках разлілі, — выказвае здагадку сяброўка. — Такім малачком зацірку не забеліш...

## *Каму дзень цвярозасці, а каму дзень пакуты*

У магазіне толькі што закончыўся абедзенны перапынак, і маладзенькая сімпатычная прадаўшчыца адчыніла дзверы насцеж, падперла іх палавінкай цагліны, бо на двары стаяла нясцерпная гарачыня. І невядома, дзе цяжэй дыхаць: у памяшканні ці на двары.

Ледзь толькі яна зайшла за прылавак, як да яго паволі падгробся пажылы чалавек. Нягледзячы на тое, што на дзвярах і ля прылаўкаў усіх дзятлаўскіх магазінаў загадзя былі налеплены аб'явы, што гэты дзень у нашым гарадку аб'яўлены днём цвярозасці, дзед ужо недзе, як кажуць, дабег і добра прыклаўся да пляшкі. Але ён, відаць, лічыў, што мала.

— Дай бутэлечку таннага віна, — просіць у прадаўшчыцы і кідае на прылавак грошы.

— Як вы мне сёння збрыдзелі, апойкі няшчасныя! — лаецца на яго маладая кабета. — З самай раніцы пруцца і пруцца: дай віна, дай віна! А ты хіба не бачыш, што і на дзвярах, і вось ля прылаўка прылеплена аб'ява: дзень цвярозасці! Зусім мазгі паадпівалі, чытаць развучыліся! Я табе прадам віна, а мяне за гэта аштрафуюць ды прэміяльных пазбавяць. А яно мне трэба? Так што ідзі адсюль! Няма ад вас паратунку, проста нейкая алкагольная саранча дый і годзе!

Дзед пашаркаў да выхаду ні з чым, але ў парозе сустрэўся з такім жа сябрам па няшчасці, толькі малодшым.

— Можаш заварочваць назад, бо ўсё роўна віна не прадасць. Дзень цвярозасці, каб ён спрах! — кажа з сумам.

— Каму дзень цвярозасці, а каму дзень пакуты, — рэзонна заўважыў сябрук, і яны абодва падаліся на вуліцу.

## *Разумеюць без слоў*

Купіўшы вацату, я прыпынілася, каб пагутарыць са знаёмай прадаўшчыцай, бо ў магазіне пакупнікоў не было. Не паспелі перакінуцца і парай слоў, як да прылаўка падышоў малады мужчына. На прыгожы твар паклаў ужо свой адбітак алкаголь. Ён дастаў з кішэні грошы і, не лічачы, кінуў іх на прылавак. Прадаўшчыца, таксама не лічачы, расклала іх у касу па вартасці купюр. Ён не прамовіў ні слова, яна таксама. Кабета дастала са скрыні, што стаяла за прылаўкам на падлозе, дзве бутэлькі таннага віна і падала маладому чалавеку. Той запхнуў іх у кішэні і моўчкі на выхад.

— Дзіўна! — не ўстрымалася я. — Як вы ведаеце, чаго яму трэба? Ён жа і слова не прамовіў.

— Нічога дзіўнага, — спакойна кажа субяседніца. — Ён кожную раніцу сюды прыходзіць. Заўсёды дае грошы без здачы на дзве бутэлькі віна. Моўчкі. Як кажуць, не вітаецца і не развітваецца.

Яна крыху памаўчала, а потым прадоўжыла:

— Шкада, добры хлопец марнуецца ад праклятага спіртнога. Як не п'е — залаты работнік, але такія перыяды, што не п'е, бываюць усё радзей і радзей...

**Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.**

*Дзятлаўскі раён.*

SOS!

# Мы што, манкурты?

Днём з агнём не знойдзеш зараз патрыётаў беларускай мовы ні сярод дэпутатаў, ні сярод высокіх уладных чыноўнікаў. Праўда, ёсць прыемнае выключэнне — наш міністр культуры Павел Латушка. Сама чула, як красамоўна па-беларуску ён адкрываў Дні культуры Сірыі ў нашай краіне. Але хацелася б ведаць, ці гучыць родная мова ў самім Міністэрстве культуры?

Хочацца адзначыць яшчэ адзін станоўчы прыклад: прыемна чуць у нашым метро аб'явы назваў станцый па-беларуску, чытаць бягучы радок на роднай мове ў аўтобусах і тралейбусах! Асобны дзякуй за гэта Міністэрству транспарту. Але выключэнні толькі пацвярджаюць правіла. Здавалася б, часы змяніліся, народы былога СССР становяцца на свой нацыянальны грунт. Толькі ў Беларусі гэты працэс спынены...

Асабіста я вярнулася да беларускай мовы дзякуючы "Народнай Волі". Аднак многія мае суразмоўцы, нават валодаючы беларускай мовай, у размовах са мной упарта не хочуць пераходзіць на родную. А гэта ж адукаваныя людзі, інтэлігенты. Я вось думаю: ці сапраўды — інтэлігенты, калі абыякавыя да мовы, гісторыі нашай? Толькі калі ведаеш пакуты нашых продкаў, іх змаганне за нацыянальную годнасць, у табе прачнецца адчуванне, што ты — беларус.

Да сораму складальнікаў падручнікаў, школьная праграма па гісторыі нярэдка падаецца скажонай, няпоўнай. І выходзіць моладзь у жыццё, не ведаючы ўсёй праўды пра сваю Радзіму. Адсюль і манкурты. Хто-небудзь чуе на вуліцах, па суседстве, каб моладзь размаўляла па-беларуску? Я, на жаль, не.

З сумам скажу: ні ў школах, ні ў дзіцячых садках, ні ў студэнцкім асяроддзі, ні на месцы працы — анідзе не гучыць родная мова. Не трэба чакаць, спадзявацца на змены "зверху", бо ў бальшыні высокіх чыноўнікаў — ігнараванне беларускага слова. Сама грамадскасць павінна патрабаваць ад улады паставіць нацыянальную мову на высокі дзяржаўны ўзровень.

А пачынаць трэба з саміх сябе. Хто забыўся — хай успомніць і сэрцам прыхінецца да матчынай мовы, далучыць да гэтага сваіх дзяцей, унукаў і аднадумцаў. Ну, і "Народную Волю" мне хацелася б бачыць цалкам беларускамоўнай.

Яшчэ раз звяртаюся да міністра адукацыі сп.Маскевіча. Гэта ўжо мой другі зварот у міністэрства. Праявіце павагу ды волю, шаноўны, каб выправіць абсурдную, недаравальную сітуацыю, да прыкладу, з выдатнай настаўніцай гісторыі Наталляй Ільініч, выхавальніцай моладзі на патрыятычных традыцыях з вёскі Талька Пухавіцкага раёна. Трэба неадкладна вярнуць яе на месца шматгадовай бездакорнай працы. Хутка новы навучальны год. Зрабіце падарунак асабіста спадарыні Ільініч, яе шматлікім вучням, бацькам ды нам. Мы ўжо стаміліся ад гэтага абсурду ў дачыненні да годнасці чалавека, які гадаваў для Беларусі годную маладую змену.

**Кацярына Аляксандраўна ЛЯВОНЕНКА.**

*Мінск.*

З НАТУРЫ

# Хто ёй дапаможа?

Падышоўшы да аўтобуснага прыпынку, я агледзеўся — ці няма каго са знаёмых? Погляд нечакана прыцягнула жанчына сталага веку, якая стаяла самотна ўбаку. Тужлівыя вочы, стомленасць на твары... Падышоў да яе, папрасіў прабачэння і спытаў: "Чаму вы такая самотная?.." Яна адказала добразычліва і проста: "Ад жыцця, ад свайго жыцця..." І мы разгаварыліся.



У яе сям'і двое дарослых дзяцей і трое ўнукаў. Сын, на бяду, не радуе, можна сказаць, нейкі шалапутны стаў. Развёўся з жонкай, некалькі гадоў жыве адзін. Раней быў добрым працаўніком на заводзе, а пасля запіў, з працы яго звольнілі. Прытуліла яго маці, а цяпер маецца, як з малым дзіцем.

Сама дзесяць год як удава, муж быў узорным сем'янінам і паважаным чалавекам у калектыве завода ЖБВ "Сельгасбуд". Нечакана памёр, і ў хаце ўсё пайшло не ў лепшы бок. Разлад, непаразуменні паміж сынам і дачкой, паміж дзецьмі і ўнукамі...

У дачкі таксама лёс не надта зайздросны. У 28 гадоў страціла мужа-кармільца: загінуў у аўтамабільнай аварыі. На руках засталіся пяцігадовая дачка і чатырохгадовы сын. Маладой жанчыне, як і многім іншым работнікам бавоўнянага аб'яднання, з-за жабрацкага заробку прыйшлося звольніцца.

Не дзіўна, што мая выпадковая субяседніца ўся ў турбоце — як дапамагчы наладзіць жыццё сваім дарагім, родным? Сваю невялікую пенсію аддае ў агульны сямейны бюджэт. Нягледзячы на гады, яшчэ працуе ў двух месцах, абы дзецям-унукам лягчэй было. Перад цяжкасцямі не гнецца, так-сяк стараецца зводзіць канцы з канцамі. Але надта стамляецца і ўвесь час у палоне звычайнага чалавечага жадання — каб жа як удосталь выспацца...

Цяпер яна едзе на другую работу, хоць адчувае сябе кепска. Адольвае слабасць, круціцца галава, ногі нібы ватныя... Мне было балюча і крыўдна, што нічым не змагу дапамагчы жанчыне, якая апынулася ў коле бязрадаснага існавання. Не давала спакою пытанне: хто ёй зможа дапамагчы? Дзяржава? Бліжэйшыя родзічы і суседзі? У іх саміх клопатаў повен рот. Хіба адна надзея на Бога.

Колькі ж мужнасці і духоўнай моцы, пры фізічнай нямогласці, у гэтай звычайнай, простай жанчыны. Колькі іх у нас такіх — ціхіх гераінь, якія, ахвяруючы сабой, жывуць змаганнем за будучыню дзяцей і ўнукаў, спаўна аддаючы ім сэрца і сілы. І ці зразумеюць нашчадкі высакародства сваёй добрай бабулі? Ці аддзячаць узаемнай пяшчотай, ці падтрымаюць хоць на астатку жыццёвай дарогі?

**Віктар БРУЦКО, жыхар г.Баранавічы.**

НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

## *Яўген ГУЧОК*



***

*Дакіраваліся
Кухаркі,
Што ўсе скрабуць
Навокал каркі.*

***

*"На Беларусі Бог жыве!"
Ды зла тут больш ўсялякай меры...
Яно сіпіць, шыпіць, раве —
Як знак духоўнае халеры.*

***

*Калі мужчына
Хлусіць,
Ён не мужчына,
Мусіць?!.*

***

*Калі ва ўладзе
Непрытомны,
То дзень ваш белы —
Быццам вугаль — цёмны.*

***

*Глядзеў у школе тупа ён
На гатавальні —
І бачыў ў іх
Прылады катавальні.*

***

*Іх не бярэ абстрэл
Маральны,
Бо надта ўжо яны —
Матэрыяльны.*

***

*Хто Духу не мае,
Той цела мацуе,
І хвост уздымае,
І надта марцуе.*

***

*А чалавек з адпітымі
Мазгамі —
Што спрынтар з перабітымі
Нагамі.*

***

*На сонцы чэрві
Сохнуць...
Рабы ў свабодзе
Дохнуць.*

***

*Мужык ты нібыта фартовы,
Ды розумам сцебануты:
Чаравік у цябе імпартовы,
Ды мазгі вось у лапці абуты.*

ДЫСКУСІЯ

# Тады мы згубім усё

Мой дзядуля Хведар, помню, распавядаў пра свайго колішняга суседа-хутараніна па мянушцы Багнік. Быў той спраўны, працавіты гаспадар, меў больш за валоку (звыш 20 гектараў) ворнай зямлі. А калі памёр, то ягоны сын Антось, не вельмі схільны да шчыравання на зямлі, распрадаў бацькаву гаспадарку, з'ехаў у Варшаву і шыкаваў там, пакуль не скончыліся грошы. Абадранцам вярнуўся ў родныя мясціны, а там — ні кала ні двара. Вяскоўцы шкадавалі небараку, хто акраец хлеба ці нават шмат сала падаваў. А ў хаты не пускалі — ведалі, што прыдбаў Антось у сваіх загульных вандроўках ганебную заразную хваробу. І хоць той, стаўшы пралетарыем-жабраком, прыбіўся ў пасляхастрычніцкі час да камуністаў, брындаў па вёсках з чырвоным сцягам і заклікам да сялян змагацца з сусветным капіталізмам, ніхто яго і слухаць не хацеў, людзі адпэнджвалі падалей ад хаты...

Згадваю гэтую показку ўсялякі раз, калі чую разважанні сённяшніх разумнікаў, якія вераць: вось распрадамо сваё дабро — лепшыя кавалкі дзяржмаёмасці ў прыватныя рукі — і зажывём прыпяваючы.

Зажывём — як той Антось, што бацькаву спадчыну пусціў па ветры...

Ну, па-першае, гэтая маёмасць **народная,** створаная працай не аднаго пакалення беларусаў. І таму належыць усім нам, а не толькі дзяржапарату, які ёю распараджаецца. Лёс найбуйнейшых прадпрыемстваў краіны — хрыбта нашай эканомікі — павінен вырашаць сам народ. А хто ў яго што пытаўся? Напрыклад, я сам, многія сябры і знаёмыя супраць распродажу, разумеюць: спакуслівыя мільярды праядзім ці пусцім на новыя лядовыя палацы — і хутка можам застацца нават без клюшкі ў руках.

Па-другое, хвалюе, у чые рукі трапіць беларускае багацце? Амаль з поўнай упэўненасцю можна сказаць, што не ў беларускія, бо ў нашых грамадзян такіх грошай не знойдзецца. Хутчэй за ўсё — у расійскія: алігархі ўсходняй суседкі даўно квапяцца на нашы індустрыяльныя "брэнды" і надзвычай упарта, асабліва апошнім часам, да іх падбіраюцца. А калі страцім эканамічную незалежнасць, згубім і незалежнасць палітычную, станем прыдаткам-калоніяй іншай дзяржавы. Тады згубім усё — і нават саміх сябе.

Разумею, тут могуць быць розныя думкі. Але здзіўляе і абурае, калі нехта, як напрыклад, чытачка А.Аншук ("Народная Воля" №№109—110) прапануе прадаваць нашу Бацькаўшчыну ў розніцу або нават цалкам — абы грошы давалі! Відаць, ёй усё роўна, хто будзе гаспадарыць на нашай зямлі, у чыіх руках апынецца лёс сучасных і будучых жыхароў нашага краю. У каго ж эканоміка, грошы — у таго і ўлада.

А наконт "роўных умоў" на міжнародных таргах для ўсіх жадаючых набыць ключавыя актывы беларускай эканомікі можна толькі пасмяяцца. Ужо сёння, да пачатку тых таргоў, можна сказаць, хто іх выйграе. Думаю, і спадарыня Аншук ведае, толькі выгляду не падае...

**Мікола КАНАХОВІЧ, ветэран Узброеных сіл.**

*г.Пружаны.*

ЧТО ТАМ, В ЛИВИИ?



# Ночь, которая вошла в историю

*Ночи на понедельник 22 августа было суждено стать переломным моментом в истории Ливии. Десятки тысяч человек собрались на Зеленой площади — в самом сердце Триполи. На площади начались настоящие торжества. Телеканал “Аль-Джазира” показал первые кадры из ливийской столицы Триполи, после того как она оказалась во власти повстанцев. На кадрах видно, как молодые люди топчут огромный портрет Каддафи и радуются приходу сил повстанцев.*

Вместе с ними празднует и город Бенгази — оплот оппозиционных сил. Между тем стрельба в городе вчера еще продолжалась. В понедельник утром ожесточенные бои шли в районе резиденции Каддафи. Перестрелки происходили и в южной части города. Как сообщало Agence France-Presse, звуки стрельбы были слышны в квартале Баб аль-Азизия, где расположен дворец полковника.

Так или иначе, минувшая ночь стала, похоже, переломной в ливийской драме. СМИ рассказывают, как это произошло.

21 августа повстанцы развернули наступление на Триполи как с запада, так и с востока, часть их сил прибыла морем. В течение суток противники Каддафи почти полностью овладели городом. Большинство защитников ливийской столицы сложили оружие.

Сообщается, что командующий подразделениями, защищавшими Триполи, сам открыл повстанцам все дороги и приказал не оказывать сопротивления. В то же время известно о 100 задержанных повстанцами бойцов “батальонов Каддафи”. По данным телеканалов “Аль-Джазира” и “Аль-Арабия”, в Триполи капитулировала президентская гвардия Каддафи.

Сын ливийского лидера Сейф-аль-Ислам Каддафи арестован и предстанет перед Международным уголовным судом. Представители Международного уголовного суда уже заявили, что намерены начать переговоры с повстанческим Национальным переходным советом об условиях его отправки в Гаагу.

Старшего сына Каддафи — Мухаммеда — едва не застрелили во время интервью, которое он давал в прямом эфире в ночь на 22 августа катарскому телеканалу “Аль-Джазира”. “Меня атакуют прямо сейчас в моем доме”, — сказал Мухаммед Каддафи, который практически не занимался политической деятельностью и не состоял на государственной службе, живя вместе с матерью, которая уже давно состоит в разводе с Муаммаром Каддафи.

США призывают Переходный национальный совет (ПНС) Ливии составить план действий, которые необходимо будет предпринять после падения режима Муаммара Каддафи. “В этот исторический момент Национальному переходному совету (в Бенгази) следует продемонстрировать лидерские качества, которые понадобятся, чтобы Ливия перенесла трансформацию, уважая при этом права жителей страны, избегая человеческих жертв, защищая институты ливийского государства и преследуя переход к демократии, которая бы распространялась на всех жителей страны”, — отметил президент США.

Представители ПНС уже заявили в ответ, что “работают изо всех сил над тем, чтобы в Ливии не образовался политический вакуум после ухода Каддафи”. Самого полковника повстанцы желают видеть перед судом в Триполи. Со своей стороны Североатлантический альянс выступает за сохранение территориального единства Ливии и готов сотрудничать с оппозиционным Переходным национальным советом. Об этом заявил сегодня генеральный секретарь НАТО Андерс Фог Расмуссен.

**Алесь ДРАБЧУК.**

КОРОТКО

## Месса в Мадриде

Глава Римско-католической церкви Бенедикт XVI отслужил в Мадриде заключительную мессу, которой завершился Всемирный католический день молодежи — международный фестиваль, объединяющий молодых католиков из разных стран мира. В богослужении участвовали около двух миллионов юношей и девушек. Папа Римский Бенедикт XVI официально объявил, что следующий Всемирный день молодежи состоится в Рио-де-Жанейро в 2013 году.

Впервые Всемирный день молодежи прошел по инициативе Папы Римского Иоанна Павла II в 1986 году в Риме и с тех пор отмечается раз в два-три года. Последний праздник состоялся 15—20 июля 2008 года в Сиднее.

## ООН осуждает Сирию

Совет ООН по правам человека рассмотрел проект резолюции, осуждающей власти Сирии за репрессии по отношению к участникам оппозиционных акций.

В документе содержится призыв — создать независимую международную комиссию для расследования массовых нарушений прав человека в Сирии. За пять месяцев волнений в стране, по данным правозащитников, погибли более двух тысяч человек.

Президент Сирии Башар Асад в своем выступлении по телевидению предостерег против силового вмешательства извне в дела его страны. Асад заявил, что силы безопасности справляются с продолжающимися акциями протеста, и заверил, что в начале будущего года в Сирии пройдут парламентские выборы на многопартийной основе.

## Северокорейский лидер Ким Чен Ир прибыл в Россию — впервые за последние 10 лет



Сегодня запланирована его встреча с президентом Дмитрием Медведевым. Согласно сообщениям российских СМИ, речь на переговорах пойдет об условиях возвращения Пхеньяна за стол переговоров по северокорейской ядерной программе. Северная Корея также обсуждает с российским газовым монополистом “Газпромом” возможность проведения газопровода по территории КНДР в Южную Корею.

## Постриглись налысо

Сто молодых венесуэльцев постриглись налысо в знак солидарности с президентом Уго Чавесом, у которого волосы выпали после курса химиотерапии. Коллективная стрижка проходила в минувшее воскресенье, одновременно с религиозным актом, для участия в котором перед президентским дворцом Мирафлорес собрались сотни евангельских христиан, молившихся за выздоровление лидера боливарианской революции. За процессом стрижки наблюдал и Уго Чавес, присутствовавший на религиозной церемонии, передает ИТАР-ТАСС.

Для участия в религиозном акте прибыли несколько молодых христиан из Доминиканской Республики, которые на прошлой неделе остригли головы в знак солидарности с Чавесом, ведущим борьбу с онкологическим заболеванием. Все они принадлежат к религиозной организации “Пас доминикана”.

## Ведущие страны тревожит насилие в секторе Газа

Очередной виток конфликта между израильской и палестинской сторонами в секторе Газа усилил беспокойство международного сообщества относительно ситуации на Ближнем Востоке.

За последние несколько дней обстановка в регионе накалилась из-за серии обстрелов территории Израиля из Газы и ударов израильской авиации по палестинской территории.

Ближневосточный квартет, в который входят США, ООН, ЕС и Россия, призывает обе стороны прекратить боевые действия.

## «Прошу казнить скорее»

Бывший вице-премьер Ирака при Саддаме Хусейне Тарик Азиз, приговоренный судом к смертной казни, попросил действующего иракского премьер-министра Нури аль-Малики ускорить исполнение приговора, объяснив просьбу ухудшением самочувствия.

УРОКИ

# Как поживают свергнутые диктаторы?

*Корреспондент The Independent Питер Стэнфорд выяснил, как поживают свергнутые в ходе «арабской весны» диктаторы, какова их судьба.*

Прежде всего его интересовала “троица”: Зин эль-Абидин Бен Али, Хосни Мубарак и Али Абдулла Салех. “*Справедливость требует, чтобы они сидели в тюрьме или предстали перед судом, ведь все трое правили посредством силы и страха,* — пишет автор. — *Но все они в настоящее время на больничных койках*”. Экс-президент Туниса Бен Али приходит в себя после инсульта в эксклюзивной клинике в Джедде (Саудовская Аравия), Мубарак после одного дня в суде находится в одном из стационаров Шарм эш-Шейха (у него проблемы со здоровьем), а Салех залечивает раны в Рияде.

Одни думают, что все это уловки, чтобы избежать правосудия, по мнению других, проблемы со здоровьем у деспотов стали следствием шока от свержения. “*Одна из опасностей неограниченной власти в том, что человек начинает верить в собственный миф. Эти три тирана (и их многочисленные родственники) решили, что дворцы, лимузины, придворные подхалимы и безлимитные кредитки... будут всегда, что эти атрибуты могут быть переданы детям как фамильная собственность. Возможно, они даже убедили себя в том, что обладают неподдельной популярностью в массах*”, — говорится в статье.

“*А затем вдруг их бесцеремонно вышвырнули за дверь, причем делали это, как правило, товарищи, которых они продвинули по службе. Банковские счета заморожены, звонки “друзьям” из числа западных лидеров остаются без ответа, начинают появляться международные ордеры на арест*”, — живописует Стэнфорд крушение иллюзий, которое пришлось пережить бывшим диктаторам.

Им больше не приходится рассчитывать на “мягкую посадку” вроде той, что была уготована иранскому шаху, филиппинскому диктатору Фердинанду Маркосу или “мяснику из Уганды” Иди Амину. Счета в швейцарских банках, как показывает пример полковника Каддафи, начинают замораживать, даже не дожидаясь окончательного свержения. Перед сегодняшними сатрапами стоит нелицеприятный выбор: “*либо остаться в своей стране и иметь дело с теми, у кого к тебе претензии, либо отправляться в единственную оставшуюся нетронутой тихую заводь, в Зимбабве к Роберту Мугабе, и держаться вместе с другими изгоями. Нет ничего удивительного, что больница вдруг стала такой желанной*”.

Что касается других опальных лидеров, то Первез Мушарраф, например, в августе 2008 года не вернулся из хаджа и затем обосновался в Лондоне, но обещает в марте будущего года вернуться в Пакистан, чтобы принять участие в выборах, продолжает автор. Пока же он “регулярно объезжает США, Европу и Ближний Восток с лекциями, получая по 100 тыс. долларов за раз, и рассказывает о том, как лично ему пришлось расплачиваться за поддержку войны против террора, которую вел Джордж Буш”.

Эту тему сейчас подхватили многие СМИ. Они рассказывают о судьбах диктаторов разных стран. Напомним о некоторых.

После краха соцлагеря некоторые руководители государств (они же лидеры правивших компартий) предстали перед судом. Наиболее коротким оказался процесс над “гением Карпат” Николае Чаушеску, железной рукой правившим Румынией с 1967 года. В декабре 1989 года он был свергнут в результате массовых выступлений народа. Чаушеску с супругой Еленой попытались бежать, но были арестованы. Заседание военного трибунала продолжалось два часа. Николае и Елена Чаушеску были признаны виновными по нескольким статьям обвинения: от организации геноцида до незаконного обогащения. Немедленно после оглашения приговора они были расстреляны. По иронии судьбы Чаушеску оказались последними людьми, казненными в Румынии, — через две недели после их расстрела смертная казнь в стране была отменена.

Эрих Хонеккер, глава Германской демократической республики, избежал приговора, несмотря на все попытки германского правосудия привлечь его к ответственности. Ему инкриминировали соучастие в убийстве 192 человек, пытавшихся бежать из ГДР в ФРГ, — Хонеккер некогда отдал приказ пограничникам вести огонь на поражение, а не пытаться задерживать перебежчиков.

После краха ГДР в 1990 году Хонеккер скрывался в советском военном госпитале, а потом был перевезен в Москву. После коллапса СССР он укрылся в посольстве Чили (Хонеккер был личным другом посла, а его дочь была замужем за чилийцем), но был выдан ФРГ. Хонеккер успел предстать перед судом, однако процесс был прерван по причине плохого состояния здоровья подсудимого. Чуть позже Хонеккер вылетел в Чили, к дочери, где в скором времени скончался от рака печени.

Несколько лет назад попытались привлечь к ответственности Войцеха Ярузельского, последнего руководителя социалистической Польши. В отличие от Чаушеску и Хонеккера, Ярузельский мирно оставил власть и после ухода в отставку некоторое время продолжал заниматься политикой. В 2006 году прокуратурой Польши ему были предъявлены обвинения: в частности, ему инкриминировалось создание неконституционных преступных структур и превышение властных полномочий. Однако Ярузельский ни разу не появился в зале суда по причине слабого здоровья. Позднее у него был обнаружен рак, и неофициально считается, что судебный процесс над ним не был продолжен.

Саддам Хусейн правил Ираком с 1979-го по 2003 год. Он был свергнут в результате вторжения сил международной коалиции, несколько месяцев скрывался, был пойман и предстал перед трибуналом, организованным временным правительством страны.

Саддам Хусейн отказался признать легитимность суда, декларируя, что остается главой иракского государства. На суде ему были предъявлены обвинения в преступлениях против человечности — обвинение сконцентрировалось на доказательстве того, что Саддам отдал приказ, результатом которого стало убийство 148 шиитов в городе Эд-Дуджейл в 1982 году, применение в отношении арестованных пыток и изнасилований. Саддам Хусейн был признан виновным, приговорен к смертной казни и через два месяца повешен.

Жан-Бедель Бокасса — президент, позже — пожизненный президент Центральноафриканской республики, впоследствии провозгласивший себя императором Центральноафриканской империи. Он управлял государством 13 лет, был свергнут и бежал за границу. В 1980 году в ЦАР прошел судебный процесс над Бокассой — бывшего президента-императора сочли виновным в многочисленных убийствах его политических противников. В 1986 году Бокасса неожиданно вернулся на родину и предстал перед судом. На этот раз ему были предъявлены обвинения по 14 статьям — от государственной измены до каннибализма. Бокасса был признан виновным по всем статьям обвинения за исключением людоедства и приговорен к смертной казни. Президент ЦАР сохранил жизнь Бокассе, заменив смертную казнь пожизненным, а позднее — 20-летним тюремным заключением. Бокасса вышел на свободу уже в 1993 году по всеобщей амнистии. Он скончался в своей постели через три года, перед этим провозгласив себя 13-м апостолом Христа. В 2010 году президент ЦАР реабилитировал Бокассу.

Пол Пот, вероятно, один из самых кровавых диктаторов второй половины XX века, был судим собственными соратниками. Пол Пот, лидер организации “Красные кхмеры”, в 1975 году захватил власть в Кампучии (ныне Камбоджа). Правление созданного им режима привело к гибели трети жителей страны (по разным оценкам, от 1,5 млн до 2,5 млн). Режим Пота рухнул после того, как на территорию Кампучии вошли войска Вьетнама. Пол Пот вместе с частью своих сторонников ушел на территорию соседнего Таиланда. В 1998 году один из его приближенных арестовал Пол Пота и организовал судебный процесс, на котором Пол Пот был приговорен к пожизненному домашнему аресту. Однако в скором времени Пол Пот скончался при странных обстоятельствах — есть подозрения, что Пол Пот, выдачи которого требовал международный трибунал, был отравлен.

Гаитянский лидер Жан-Клод Дювалье после народного восстания 1986 года укрылся во Франции, где вел роскошную жизнь в особняке под Каннами. Когда туда нагрянула полиция, жена Дювалье “выбросила *ноутбук с данными о своих недавних тратах, включавших два детских седла от Hermes за 7500 фунтов*”. После развода в 1993 году экс-диктатор, по его словам, “остался без копейки”. В январе 2011 года он неожиданно вернулся на родину (предположительно для того, чтобы подкрепить свои претензии на деньги с замороженных счетов), но был арестован и сейчас ожидает суда по обвинению в коррупции, рассказывает издание.

Чарльз Тейлор, президент Либерии в 1997—2003 годах, сбежал в Нигерию, но в 2006 году был выслан и предстал перед особым трибуналом по Сьерра-Леоне в Гааге.

Бывшая первая леди Филиппин Имельда Маркос, улизнув вместе с мужем на Гавайи, оставила *“3000 пар обуви и горы дорогих и безвкусных вещей”,* но впоследствии смогла загладить неприятное впечатление о себе. В 1989 году она овдовела, на следующий год американский суд снял с нее обвинения в вымогательстве и мошенничестве, а еще через год она вернулась на родину и была избрана в Национальный конгресс и даже дважды показала неплохие результаты на президентских выборах.

Муаммар Каддафи, по словам Стэнфорда, *“может убегать, но ему не спрятаться”.* Опция внутренней ссылки ему, похоже, уже недоступна, а что до высылки за рубеж, то даже Саудовская Аравия не подходит, поскольку в 2004 году тамошние власти обвинили полковника в подготовке покушения на короля. Маловероятными считаются и такие варианты, как Гана, Чад, Буркина-Фасо и Венесуэла. “*Будущее Каддафи, как и Ливии, остается туманным*”, — заключает автор.

Когда этот материал был подготовлен к печати, стало известно, что бывший президент Туниса Зин эль-Абидин Бен Али признан виновным в коррупции и мошенничестве с недвижимостью и приговорен тунисским судом к 16 годам тюрьмы. Дочь Бен Али Несрин и зять экс-президента предприниматель Сахер аль-Матри, также обвинявшиеся в мошенничестве с недвижимостью, получили 8 и 16 лет лишения свободы соответственно. Никто из обвиняемых на суде не присутствовал, решения выносились заочно.

Это не первый срок, к которому приговаривают экс-президента. Так, суд Туниса 20 июня заочно приговорил Бен Али и его супругу Лейлу Трабелси к 35 годам тюремного заключения каждого по обвинению в хищении государственных средств. Суд также обязал Бен Али выплатить штраф в размере 50 миллионов тунисских динаров (25 миллионов евро), а супруга экс-президента была оштрафована на 21 миллион динаров.

В начале июля тунисский суд приговорил бывшего президента Туниса Бен Али к 15,5 года заключения и штрафу в 54 тысячи евро за хранение оружия и наркотиков. Кроме того, племянник экс-президента Туниса Софьен Бен Али признан виновным в хранении наркотиков и приговорен тунисским судом к двум годам лишения свободы и штрафу в размере 1,4 тысячи долларов.

**Подготовил к печати Андрей РУСАКОВИЧ.**

У НИХ...

# Отпуск Обамы: шквал критики

На днях сообщили, что Александр Лукашенко после визита в Катар отдыхает в Сочи. Но где конкретно и какая продолжительность отпуска, не сказано. В это же время уехал в отпуск и президент США Барак Обама. Было сказано, что он проведет с семьей 10 дней на острове Мартас Виньярд в штате Массачусетс. СМИ рассказали и об острове, и о вилле, на которой отдыхает президент, и о стоимости его отдыха. И тем не менее в обществе и СМИ разгорелась дискуссия о том, надо ли было президенту идти в отпуск именно в это время и ехать на не самый дешевый остров...

Республиканцы и некоторые демократы подвергли президента Обаму критике за то, что он отправился в 10-дневный отпуск. Критики недовольны выбранными временем и местом отпуска.

Объявляя 10 августа о том, что президент хочет провести некоторое время вместе с семьей за пределами Вашингтона, пресс-секретарь Белого дома Джей Карни, по-видимому, ожидал, что это понравится не всем. “В конце августа президент вместе с семьей планирует посетить Мартас Виньярд, где он уже бывал. Я не думаю, что американцам следует выражать недовольство по поводу того, что президент хочет провести какое-то время со своей семьей”.

Однако некоторые американцы считают, что президенту не следует покидать Белый дом в условиях, когда финансовые рынки лихорадит, а уровень безработицы остается высоким. Среди наиболее известных критиков президента губернатор Массачусетса Митт Ромни, один из ведущих потенциальных кандидатов в президенты от Республиканской партии.

Ромни отметил, что Обама отправляется в отпуск сразу же после трехдневного автобусного турне по штатам Среднего Запада. Он также отметил, что президенту следует обнародовать свой новый экономический план, не дожидаясь окончания отпуска. “Радует то, что он посвятит этому хотя бы какое-то время. Так что он не только ездит по стране на автобусе, не только отдыхает на Мартас Виньярд, но даже немного думает об американском народе. Я думаю, этим ему следовало заниматься с самого первого дня”.

Причем критикуют Обаму не только его политические оппоненты. Некоторые демократы выражают обеспокоенность по поводу того, как выглядит эта ситуация: президент отдыхает на роскошном курорте, в то время как миллионы американцев не имеют работы. Колберт Кинг, отвечающий в газете Washington Post за колонку, посвященную общественному мнению, обычно поддерживает Обаму. Однако в своей недавней статье он заметил, что президенту следует уделять какое-то время людям, которые не могут позволить себе отпуск, вместо того чтобы проводить время “в роскошном уединении среди богатых и знаменитых”.

Историк, профессор Американского университета в Вашингтоне Эллан Лихтман говорит, что Обама — не первый президент, подвергшийся столь жесткой критике за желание отдохнуть. “Критиковать каникулы президента — это старо, как мир, и так же свежо,



как вчерашние газеты”.

В 50-е Дуайт Эйзенхауэр неоднократно становился объектом язвительных замечаний по поводу его пристрастия к гольфу. Демократы критиковали президентов-республиканцев Рональда Рейгана и Джорджа Буша-младшего за их довольно продолжительные отпуска.

После нескольких жестко раскритикованных поездок на Мартас Виньярд демократ Билл Клинтон поручил своим помощникам провести опрос общественного мнения на тему “Где должен отдыхать президент?”. В результате ему пришлось отправиться в Джексон-Хоул в западном штате Вайоминг.

Пресс-секретарь Белого дома Джей Карни отмечает, что, находясь в отпуске, президент не всегда имеет возможность забыть о работе. “Нет такой вещи — президентские каникулы. Куда бы ты ни поехал, твои президентские обязанности едут с тобой. Он будет постоянно поддерживать связь и регулярно консультироваться со своими советниками по вопросам национальной безопасности, с экономическими советниками и, конечно же, при необходимости, сможет быстро вернуться обратно. Это не очень далеко”.

Находясь в Мартас Виньярд, президент по крайней мере какое-то время посвятит работе над планом создания рабочих мест и сокращения бюджетного дефицита. Свои предложения он должен представить в начале сентября, сообщается на сайте “Голос Америки”.

Заметим, что аренда поместья, в котором остановился Барак Обама, стоит примерно 50 тысяч долларов за неделю. Часть этой суммы президент оплатил из собственного кармана. А сколько денег налогоплательщиков Беларуси ушло на отдых Лукашенко в Сочи? Заплатил ли он какую-то часть из собственного кармана? Не известно.

**Подготовил к печати Андрей КОВТУН.**

Народная Воля
http://www.nv-online.info
23 ЖНІЎНЯ 2011 г.

ПОСТАЦІ

# Дон Ігнасіо з Мядзведкі,

## альбо Як адзін беларус стаў народным героем... Чылі

*"...Памятаю, як дзесяць год таму ЮНЕСКА аб'явіла 2002 год годам Ігната Дамейкі,* — піша ў "Народную Волю" Людміла Рыгораўна Бараноўская з вёскі Навінка Мінскага раёна. — *У ЮНЕСКА не прамінулі ўспомніць і нагадаць свету пра чалавека, які шмат зрабіў для цывілізацыі, а вось на радзіме двухсотгоддзе былога віленскага філамата, вядомейшага вучонага і гуманіста амаль не заўважылі. Крыўдна! Крыўдна, бо і па сённяшні дзень ніводная вуліца, ніводная плошча ні ў сталіцы, ні на радзіме Ігната Іпалітавіча — на Гродзеншчыне — не ўвекавечаны ягоным слаўным імем. За акіянам ёсць цэлы горад Пуэрта-Дамейка, не кажучы ўжо пра музеі, помнікі, універсітэт... Чаму ж наша цяперашняя ўлада забылася пра аднаго з лепшых сыноў Айчыны?! Ці, можа, ёй бліжэй імёны ленінцаў-сталінцаў, якімі названы лепшыя вуліцы нашых гарадоў?! А можа, яна папросту не ведае гісторыю сваёй Бацькаўшчыны? Калі так, то няхай "Народная Воля" зоймецца лікбезам ды нагадае чыноўнікам пра тых, імёнамі каго варта было б назваць многія з вуліц беларускіх гарадоў. Такіх выбітных асоб у нашай гісторыі шмат, і адна з іх — Ігнат Дамейка. Праз якія 11 месяцаў адзначацьмем 210-годдзе з дня народзінаў славутага земляка. Час яшчэ ёсць — каб усвядоміць, прыняць рашэнне, увекавечыць, уганараваць слаўным імем хоць якое месца на Бацькаўшчыне, не чакаючы напаміну з боку ЮНЕСКА",* — заканчвае свой ліст спадарыня Бараноўская.

**Толькі ў канцы жыцця Дамейку было дазволена наведаць радзіму. І ў 1884 годзе Ігнат Іпалітавіч разам з сынамі прыехаў у родныя мясціны. Пабываў у Мядзведцы, Міры, Навагрудку, Крошыне. Пасадзіў у Крошыне дубок, а мясцовы каваль Паўлюк Багрым (вядомы потым паэт) высек памятны надпіс на вялізным камені ў гонар знакамітага земляка. Яшчэ праз нейкі час, пасля падарожжа ў Італію і Палесціну, Дамейка вярнуўся ў Чылі. Але 23 студзеня 1889 года ў Сант'яга перастала біцца сэрца былога віленскага філамата. Дзень яго пахавання быў аб'яўлены днём нацыянальнай жалобы. Не на Беларусі, вядома, а ў Чылі. Чылійцы высока ацанілі заслугі апальнага ў Расійскай імперыі беларуса. Ігнат Дамейка быў абвешчаны народным героем Чылі. У гонар яго быў адліты памятны медаль, імем малазнанага ў Беларусі чалавека назвалі адзін з партовых гарадоў (Пуэрта-Дамейка), вулканічны ланцуг гор у Андах, а таксама адкрыты ім мінерал (дамейкіт) і фіялкавую кветку (віёла дамейкона). У доме, дзе жыў вучоны, быў створаны музей, а ў Сант'яга пастаўлены помнік "Грандэ Эдукатору" (вялікаму асветніку)... На радзіме ж пра Ігната Іпалітавіча помнілі адно хіба тыя, хто імкнуўся да волі і асветы, да незалежнасці сваёй краіны. Але гэта не віталася ні ўладай, ні яе хаўруснікамі-памагатымі з ліку тутэйшых манкурціянцаў. Ну, прыкладна як і зараз...**

**Дык хто ж вы, Ігнат Іпалітавіч, на самай справе?.. За што вас гэтак палюбілі лацінаамерыканцы? І за якую такую вашу "правіннасць" — аж да цяперашняга часу — угневаны нашы манкурціянцы-прыстасаванцы? Не так жылі, не таму кланяліся, не з тымі сябравалі, мелі свае перакананні?..**
**Паспрабуем разабрацца...**



### Універсітэты Ігната

Ён нарадзіўся непадалёку ад Міра (цяпер Карэліцкі раён) у маёнтку Мядзведка, у сям'і старшыні Навагрудскага земскага суда Іпаліта Дамейкі. Мясцовыя і цяпер пераказваюць, што Дамейкі мелі драўляны палац з вежай, што жылі не надта заможна, што ладзілі з месцічамі і не крыўдзілі басоту. Ва ўсялякім разе такая пагалоска пераходзіла з пакалення ў пакаленне і дайшла да нашага часу. Маленства Ігнаціка так і прайшло — у адукаванай сям'і, але сярод сялян і пад прыглядам прыгоннай цёткі Тадоры, якая навучыла хлапчука размаўляць па-беларуску. Ужо вядомым чалавекам, прыехаўшы на радзіму ў канцы жыцця, Ігнат Іпалітавіч прыгадваў тую прыгонную Тадору, якая навучыла яго мове і людскасці, адкрыла прасціну мужыцкага жыцця... Ці не Тадорыны "ўніверсітэты" і паспрыялі таму, што далей — праз усё жыццё — Ігнат Дамейка ніводным крокам сваім не адступіўся ад інтарэсаў простага чалавека? Ні тут — на радзіме, ні там — за акіянам. Таму, верагодна, і стаў народным героем, што блізка быў да народа...

Дык вось, у 1816 годзе Ігнат пакінуў хатнія пенаты і, закончыўшы спачатку калегію ў Шчучыне, паступіў у Віленскі ўніверсітэт на фізіка-матэматычны факультэт. Несумненна, у юнака меліся вялікія здольнасці да навук. Ён з ахвотаю спасцігаў не адно матэматыку, прыродазнаўства, але і гісторыю, літаратуру, філасофію. Не прапускаў ніводнай лекцыі такіх знаных вучоных, як Лялевель, браты Снядэцкія, Франк, Бароўскі. Тым часам разам з Дамейкам у Віленскім універсітэце вучыўся яшчэ адзін наш зямляк, імя якога было добра вядома аматарам паэзіі і які неўзабаве стане вядомым усёй Еўропе, — Адам Міцкевіч. Пазнаёміўшыся з Ігнатам, Міцкевіч і ўцягнуў апошняга ў тайнае таварыства філаматаў пад канспіратыўным імем Жэготы. З таго ўсё і пачалося. Дамейка пасябраваў у Вільні з многімі філаматамі, з тымі маладымі людзьмі, для якіх лёс Бацькаўшчыны быў важней за асабісты лёс. Сярод іх варта згадаць перш-наперш Яна Чачота ды аднаго з першых польскіх паэтаў-рамантыкаў Тамаша Зана, які пасля быў сасланы царскімі ўладамі ў Арэнбургскую губерню. Ігнат не толькі падзяляў погляды сяброў-філаматаў ("што імкнуцца да ведаў"), але і непасрэдна ўдзельнічаў у тайных сходках. Больш за тое, маладыя патрыёты, лозунгам якіх было "Айчына, навука, дабрачыннасць", часта выязджалі ў тую ж Мядзведку, якая потым была ўвекавечана Міцкевічам у ягонай эпапеі "Пан Тадэвуш" (сцэна дуэлі паміж Дамейкам і Давейкам). Дарэчы, у адну з такіх паездак Ігнат пазнаёміў Міцкевіча са сваёй стрыечнай сястрой Марыляй Верашчака. Як вядома, Адам моцна пакахаў дзяўчыну, толькі гарачае пачуццё не мела шчаслівага выніку: Адам Міцкевіч не быў настолькі багаты, каб Верашчакі наважыліся аддаць за яго сваю дачку...

Але вернемся да нашага героя — Ігната Дамейкі, якому нібыта самім лёсам было наканавана прадзёрціся праз айчынныя церні ды цемрашальскія айчынныя лёхі і падняцца ў сваёй славе вышэй Анд... У 1823 годзе шпікам удалося натрапіць на след тайнага, значыцца, незаконнага таварыства філаматаў. І вось вынік: больш за сотню юнакоў былі кінуты ў турэмныя казематы. Міцкевіч і Дамейка апынуліся ў сценах старога базыльянскага манастыра. Пазней, апісваючы тую "адсідку" ў вязніцы, Міцкевіч намалюе свайго сябра ў паэме "Дзяды" — канечне, у вобразе Жэготы. Той распавядае таварышам па вязніцы алегарычную гісторыю пра д'ябла, які вырашыў пасмяяцца з чалавека, закапаўшы ў зямлю жыццядайнае зерне. Але не ведаў чарцяка, што зерне можа даць новыя ўсходы. У алегарычнай карціне хаваўся глыбокі сэнс. Сапраўды, імперскія "шасцёркі" хоць і адправілі Міцкевіча і ягоных сяброў ("прамяністых") у турму, затым у высылку (Дамейка апынуўся пад строгім наглядам паліцыі ў вёсцы Заполле на Лідчыне, а потым у Жыбуртоўшчыне ля Дзятлава), зерне, кінутае філаматамі, не знікла дарэмна. Як тут не ўзгадаеш прарочыя словы яшчэ аднаго "прамяністага", але які народзіцца нашмат пазней Міцкевіча і Дамейкі і будзе звацца Максімам Багдановічам?: *"Й хоць зернейкі засохшыя былі // усё ж такі жыццёвая іх сіла// збудзілася і буйна ўскаласіла// парой вясенняй — збожжа на раллі"...* Гісторыя хоць і паўтараецца, але кожны раз па спіралі — на віток ці два далей ад гнюснасці і крыху бліжэй да справядлівасці... Так было, ёсць і будзе. Аж да тае пары, пакуль Уладар усяго давацьме людзям шанец быць па сваім вобразе і падабенстве, а не па вобразе д'ябла і яго памагатых... Ва ўсе часы і ва ўсіх народаў былі свае прамяністыя, свае геніі і свае прарокі. Роўна як было і застаецца (а на Беларусі — больш, чым дзе) д'ябальскае насенне, якое прарастае нашмат хутчэй, чым семя жыццядайнае. Ці не таму поле Беларусі такое дзікае дасюль, што тут усё яшчэ пераважае д'ябальскае, асцюкавата-вусатае, чорнае семя?.. А тое генетычна-прамянёвае, чыстае і высакароднае колькі ні кідаецца ў раллю, не можа ўзысці, і як след закаласіцца над гонямі Бацькаўшчыны. Яно, як і ў папярэднія эпохі, пакуль усё яшчэ за кратамі... І ўсё ж, як справядліва адзначыць ужо ў наш час патрыярх беларусазнаўства, вядомейшы славіст і культуролаг Адам Мальдзіс, прыклад філаматаў натхніў на барацьбу іншыя пакаленні. Дадамо: і зараз натхняе, колькі тое зернейка ні забіваюць капытом у зямлю...

Як жа далей складваўся лёс нашага земляка, які так хацеў роднаму краю асветы, свабоды, годнасці, але якомуназаўсёды забаранілі пераступаць на дзяржаўную службу і нават займацца грамадскай дзейнасцю? Ну вось, зноўку "дэжавю", як цень за намі ходзіць, варта проста азірнуцца... Але што Ігнат Дамейка, ці скарыўся лёсу, новым для сябе абставінам? Не, не скарыўся! І не збочыў са шляху, які быў яму наканаваны як не самім Госпадам.

Жыццё ў ссылцы было нялёгкім, тым не менш глухамані, адарванасці ад цывілізацыі Дамейка проціпаставіў навуку — распачаў навукова-практычную дзейнасць па вырошчванні хатняй жывёлы. І дасягнуў за кароткі тэрмін адчувальных вынікаў.

Але неўзабаве, у халодную лістападаўскую ноч 1830 года, нібы працягваючы справу філаматаў, нападам на Бельвэдэр пачала ўзброенае паўстанне варшаўская моладзь... За кароткі час паўстанне перакінулася на Беларусь і Літву. Канечне, Ігнат Дамейка адразу прымкнуў да паўстанцаў. Разам з іншымі далучыўся да арміі генерала Хлапоўскага і ў яго шэрагах змагаўся супраць расійскіх акупантаў, якія дзесяцігоддзямі душылі ўсё нацыянальна-прагрэсіўнае на Беларусі. Тут варта ўспомніць, што побач з Дамейкам адважна і самаахвярна змагалася легендарная Эмілія Плятэр, яшчэ адна "прамяністая". Пераапранутая ў мужчынскі касцюм, яна са сваім конным атрадам наводзіла жах на расійскіх карнікаў. І ўсё ж, нягледзячы на адчайны супраціў царскім уладам, паўстанне было задушана — яго не падтрымалі прыгонныя сяляне. У ярме жыць спадручней, дармо, што ты прыгонны, дармо што "пан сахі і касы", як скажа потым Купала. Перанясіцеся ў наш час, і вы сустрэнеце ўсё той жа цень "дэжавю" — векавы спадарожнік беларуса...

У 1832 годзе разам з паўстанцкай арміяй Дамейка вымушаны быў перайсці мяжу ў раёне Круляўца, адкуль і быў інтэрніраваны прускімі ўладамі. Крыху пазней, вызваліўшыся з палону, Ігнат сустракаецца ў Дрэздэне з Адамам Міцкевічам, і яны разам едуць у Францыю...

### Няскораны дысідэнт

У Парыжы Дамейка апынуўся ў самым цэнтры эміграцкага руху. Тут знайшлі прытулак многія з былых паўстанцаў як з Польшчы, так і з нашага краю. Ігнат часцяком выступаў з палымянымі прамовамі на мітынгах, заклікаючы таварышаў працягваць барацьбу з рускім царызмам. Там жа ён зблізіўся з такім выдатным дзеячам на эміграцыі, як былы прафесар Віленскага ўніверсітэта Іяхім Лялевель. Пасябраваў таксама з ураджэнцам Слонімшчыны Міхалам Валовічам, які ў 1833 годзе вярнуўся на Беларусь і спрабаваў тут узняць новае паўстанне, за што і быў павешаны ў Гродне.

Тым часам найлепшы сябра Ігната Адам Міцкевіч працаваў над паэмай "Пан Тадэвуш". І сам Ігнат не губляў часу дарма — хадзіў не толькі на патрыятычныя сходы, але і наведваў лекцыі ў славутым Калеж дэ Франс, Сарбонскім універсітэце і Горнай школе. А калі выпадала вольная хвіліна, дапамагаў Міцкевічу перапісваць рукапісы паэмы.

У 1837 годзе наш герой складае геалагічную, гідралагічную і гаспадарчую карты зямель былой Рэчы Паспалітай, піша геаграфічны каментарый да іх. І, нарэшце, у Парыжы друкуецца лепшы на той час геаграфічны атлас Польшчы, у якім без пазначэння аўтарства прадстаўлены яго карты і каментары да іх. Такім чынам, Дамейку з поўным на тое правам можна лічыць заснавальнікам фізіка-геаграфічнага раяніравання Польшчы, Беларусі і Літвы.

Аднак усё гэта мала задавальняе ўчарашняга паўстанца. Урэшце ў снежні 1837 года па рэкамендацыі парыжскіх прафесараў ён прымае прапанову чылійскага ўрада і падпісвае кантракт на пасаду выкладчыка Горнай школы ў горадзе Какімба на поўначы Чылі.

Выпраўляючыся ў марское падарожжа на англійскім караблі "Спей", малады вучоны нават не падазраваў, што ягонае знаходжанне ў далёкай краіне зацягнецца на 46 гадоў. Тым больш ён не мог уявіць, што Чылі стане для яго другой радзімай.

### У Новым Свеце...

Сышоўшы на бераг у Рыо-дэ-Жанэйра, наш герой наняў некалькі мулаў і коней для перавозкі закупленага ў Парыжы лабараторнага абсталявання і рушыў у дарогу. Яму прыйшлося падарожнічаць амаль праз увесь кантынент. Мучыла спёка, даймалі дзікія плямёны, у гарах пагражалі абвалы... І вось нарэшце за адным з перавалаў у Андах Ігнат Дамейка сустрэў першых чылійцаў — карэнных жыхароў краіны, якія толькі ў 1818 годзе вызваліліся ад прыгнёту іспанскіх каланізатараў. Усё было для яго цікава і незвычайна — твары людзей, іх вопратка з грубых шарсцяных тканін, каларытныя нацыянальныя танцы, гульні, звычаі.

Неўзабаве, авалодаўшы за якія тры месяцы іспанскай мовай, малады беларус пачаў чытаць лекцыі па хіміі і мінералогіі ў Горнай школе горада Какімба. Рэгулярна разам са студэнтамі выпраўляўся ў горы, туды, дзе здабываліся серабро, медзь, золата. Нагледзеўся на жахлівыя ўмовы працы тамтэйшых рудакопаў і золатаздабытчыкаў. Яго настолькі ўзрушыла, а дакладней сказаць, абурыла ўбачанае на шахтах, што ён тут жа, як толькі вярнуўся з гор у Какімба, паслаў ураду петыцыю, у якой запатрабаваў неадкладна палепшыць умовы працы шахцёраў. Неверагодна, але ўрад выканаў усе ягоныя патрабаванні. У 1840 годзе Дамейка зноў накіраваўся ў горы, але ўжо з геалагічнай экспедыцыяй. Там ён адкрыў невядомыя дагэтуль навуцы залежы альгамату серабра, які атрымаў назву аркерыт. Яго вучань Нікалас Наранью знайшоў багатую срэбраносную жылу, якую назваў імем свайго настаўніка — "Міна дэ Дамейка".

### Абаронца індзейцаў

Тэрмін кантракта з чылійскім урадам заканчваўся ў 1843 годзе. Зразумела, Ігнату хацелася вярнуцца на радзіму: неаднойчы па начах мроіліся навагрудскія ды мірскія прасёлкі, рэчка Уша, Вільня, мядзведская сяліба, сябры маленства і юнацтва. Яму, як напіша ўжо ў наш час жыццяапісальнік многіх былых філаматаў прафесар А.Мальдзіс, было душна ў мурах, узведзеных іспанскімі канквістадорамі. Але вярнуцца не выпадала, бо ў царскай Расіі яго непазбежна чакала ссылка ці нават турма. І вучоны застаўся ў чылійскай сталіцы Сант'яга. У нацыянальным універсітэце яму прапанавалі кафедру прафесара хіміі і фізікі.

Неўзабаве наш герой пазнаёміўся з пятнаццацігадовай мясцовай прыгажуняй Гюзман дэ Сатамаер, якая і стала яго вернай спадарожніцай па жыцці. Маладыя пабудавалі на ўскрайку сталіцы ўтульны домік, а наўкол разбілі экзатычны сад. Менавіта ў гэтым доме была напісана большасць навуковых прац нашага земляка. Тут, ля ўтульнага каміна, неаднойчы збіраліся лепшыя людзі Чылі — вучоныя, дзяржаўныя дзеячы — і раіліся, што ж зрабіць дзеля прагрэсу краіны. І не толькі раіліся. Да прыкладу, па заданні ўрада Дамейка распрацаваў і ажыццявіў нацыянальную школьную рэформу, з-за чаго навучанне ў Чылі стала і больш дэмакратычным і больш даступным для простых людзей, для беднякоў.



**Бюст Ігната Дамейкі ля галоўнага будынка Універсітэта Чылі.**

І ўсё ж Ігнат Дамейка заставаўся прыроджаным падарожнікам. Яго вабіла нязведанае, недаследаванае, загадкавае. Хутка ён выпраўляецца ў новую вандроўку — туды, дзе жыло маладаследаванае паўдзікае племя араўканцаў.

Вышэйзгаданае падарожжа Ігнат Іпалітавіч апісаў у кнізе "Араўканія і яе жыхары", якая ў 1860 годзе выйшла ў Вільні на польскай мове і была перакладзена на многія мовы свету. У гэтай працы Дамейка горача абараняў правы індзейцаў, іх культуру. У процівагу многім даследчыкам даказваў, што карэнныя насельнікі Чылі індзейцы — сумленныя і гуманныя людзі, што яны жадаюць жыць у міры і згодзе з астатнімі людзьмі краіны.

### Вяртанне «не блуднага сына»

Ігнат Іпалітавіч не толькі адкрыў і здаў у эксплуатацыю сярэбраныя радовішчы ў Чаньяркільё, медныя радовішчы на поўдзень і поўнач ад Кап'япа, невялікія выкапні золата ў Каўкенес, медзі ў Дэ-ла-Кампанья, але і даследаваў, а затым і прапанаваў выкарыстоўваць мінералы: амальгамат серабра і злучэнне мыш'яку з меддзю, пазней гэтае злучэнне назвалі "дамейкіт". Ён адным з першых звярнуў увагу на каштоўнасць чылійскай салетры, якая стала шырока вядомай як мінеральнае ўгнаенне. Цікава, што раён здабычы салетры на поўначы межаваў з тэрыторыяй Тарапака, на якую прэтэндавалі Балівія і Перу. Чылі аб'явіла гэтым дзяржавам вайну з мэтаю захопу багатых на салетру раёнаў. Вайна працягвалася да 1884 года і скончылася захопам сталіцы Перу Лімы і поўнай перамогай Чылі. Але Дамейка ставіўся да гэтай вайны адмоўна. І ўжо зусім вывела яго з сябе, калі чылійскія генералы прыслалі яму ў падарунак захопленае імі абсталяванне і бібліятэку ўніверсітэта ў Ліме. Раз'юшаны Ігнат Іпалітавіч адправіў ім наступны ліст: "Універсітэт нарабаваных трафеяў не прымае. Прашу неадкладна забраць рэчы назад!"

Цалкам верагодна, што якраз у гэты складаны час у нашага героя і ўзнікла думка наведаць радзіму ды і ўвогуле Еўропу... Тым больш што яго там ужо добра ведалі — і як вучонага, і як асветніка, і як грамадскага дзеяча. Не дзіва: сын беларускай зямлі, ён увайшоў у сусветную навуку, пакінуў прыкметны след у самых розных галінах чалавечых ведаў. Мінералогія і фізіка, хімія і металургія, геаграфія і батаніка, геалогія і педагогіка, этнаграфія і заалогія — абсягі ягонай дзейнасці. За свой доўгі жыццёвы шлях ён адкрыў багата залежаў серабра і медзі, напісаў 130 навуковых прац, якія друкаваліся на французскай, нямецкай, польскай, англійскай, іспанскай і іншых мовах.

Удзячная чылійская грамадскасць тройчы выбірала Дамейку рэктарам універсітэта ў Сант'яга. Ад рэктарства ён адмовіўся толькі ў 1884 годзе. І адмовіўся па гуманнай прычыне — у знак пратэсту супраць захопніцкай вайны Чылі з суседняй Рэспублікай Перу. У тым жа 1884 годзе, памеркаваўшы, што царскія ўлады ўжо не ў сіле яму перашкодзіць, Дамейка рашаецца ехаць на радзіму.

...І вось яго ўрачыста вітаюць у Сарбоне. Цікава, што Ігнат Іпалітавіч вяртаўся ў Еўропу не з пустымі рукамі — ён прывёз у падарунак еўрапейскім універсітэтам багатую калекцыю мінералаў. У Кракаве яму прысуджаюць навуковую ступень ганаровага доктара. На варшаўскім пероне яго сустракае даўні сябар Антон Адынец, адзіны з кагорты філаматаў, што застаўся ў жывых. Нарэшце з Варшавы сябры разам спецыяльным цягнікам выпраўляюцца на родную старонку — у Беларусь. Царскія паслугачы і тут паспрабавалі перашкодзіць, на чатыры месяцы затрымаўшы ў Гродне пашпарт вучонага. Але мясцовы люд, асабліва інтэлігенцыя, з незвычайнай цеплынёй віталі свайго знакамітага земляка, чалавека з легендарным лёсам. Ды і сяляне падносілі яму хлеб-соль, віталі песнямі. Гэткі б энтузіязм ды падчас вызвольнага паўстання 1830 года!.. Але ж не, беларусы ў сваёй большасці, на жаль, не такія...

Пагасцяваўшы ў Міры, Навагрудку, Крошыне, Ігнат Іпалітавіч, расчулены ўбачаным, а яшчэ больш успамінамі, надумаў было застацца ў краіне свайго юнацтва. Але ж хіба дадуць яму спакойна жыць і працаваць?.. Наўрад ці. І таму наш герой са слязамі на вачах развітаўся з радзімай і рушыў у зваротны шлях. Па дарозе ў Чылі наведаў яшчэ Італію, Стамбул, Палесціну і Егіпет, а потым, нейкі час пажыўшы ў Парыжы, адплыў за акіян. Праз чатыры месяцы пасля адплыцця ён памёр у сваім доме ў Сант'яга...

На пахаванні вялікага даследчыка і гуманіста выступіў прэзідэнт Рэспублікі Чылі спадар Бальмаседа. Ён, выразіўшы волю ўсіх чылійцаў, і абвясціў Ігната Дамейку народным героем Чылі.

**У далёкай ад нас лацінаамерыканскай краіне і па сёння шануюць памяць пра чалавека, які столькі зрабіў для ўсіх. А як у нас? Ці ёсць хоць адзін музей, прысвечаны яму? Канечне, Ігнат Дамейка большую палову свайго жыцця, поўнага навуковых адкрыццяў і практычных здзяйсненняў, прысвяціў іншай краіне. Але ж не яго ў тым віна. Ён, як і яго паплечнікі-філаматы, зрабіў усё магчымае, каб наблізіць свой народ да асветы і свабоды. Толькі, як ні прыкра ўсведамляць, сам народ быў далёкі ад памкненняў лепшых сваіх прадстаўнікоў — "прамяністых". Зрэшты, ці аднойчы такое здаралася ў нашай шматпакутнай гісторыі?.. І напраўду, відаць, гісторыя вучыць толькі таму, што нічаму не вучыць... Ці гэта мае дачыненне толькі да нас, беларусаў?..**

**Георгій ЧЫГІР.**

## Да фестывалю гатовы

*Дырэкцыя "Лістапада-2011" адабрала амаль усе конкурсныя і пазаконкурсныя кінастужкі, якія будуць прадстаўлены на форуме 5—12 лістапада. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў аргкамітэце.*

*"Размова ідзе аб дзясятках кінастужак з усяго свету, якія будуць размеркаваны па трох секцыях: ігравое, дакументальнае і дзіцячае кіно",* — растлумачылі арганізатары.

## Піт Паўлаў прызнаўся ў памылках

*Цяперашні лідар гурта N.R.M. гітарыст і спявак Піт Паўлаў заявіў, што аднолькавы стыль электрычных і акустычных канцэртаў — памылка, вартая выпраўлення.*

26 жніўня гурт рыхтуе вялікі акустычны канцэрт. Упершыню ў гісторыі каманды яны дадуць "канкрэтны unplugged".

*"Ніколі яшчэ ў сваёй гісторыі мы не гучалі настолькі камерна,* — прызнаўся парталу "Тузін гітоў" Паўлаў. — *Раней на акустычных выступленнях мы гралі гэтак жа, як на электрычных. І гэта была памылка, якую мы выправім у апошнюю пятніцу лета".*

Апошні летні канцэрт падвядзе рысу пад першым турам без Лявона Вольскага. Зараз музыкі плануюць апрацаваць відэа, знятае падчас падарожжаў, і паказаць яго гледачам 26 жніўня. Паралельна яны рыхтуюць новы альбом пад працоўнай назвай "ДПБЧ".

## У Брэсце не хочуць вучыцца па-беларуску

*Такую выснову зрабіў начальнік аддзела адукацыі Брэсцкага гарвыканкама Анаталь Наскоў.*

У інтэрв'ю газеце "Вечерний курьер" чыноўнік, адказваючы на пытанне, якія прымаюцца захады, каб пашырыць сферу ўжывання беларускай мовы ў сістэме адукацыі Брэста, адзначыў:

— Калі бацькі жадаюць, каб іх дзеці вучыліся ў беларускамоўных класах, — гэта іх законнае права. Ад аддзела адукацыі патрабуецца толькі рэалізаваць яго, нават калі ў такі клас прыйдзе ўсяго адзін вучань. Іншая справа, што жадаючых вучыцца ў беларускамоўных класах, як паказвае жыццё, у Брэсце вельмі мала. Так, у новым навучальным годзе па заявах бацькоў такі клас з'явіцца ў пачатковай школе №34. Шмат гадоў выкладанне прадметаў у пачатковай школе гімназіі №3 вядзецца выключна па-беларуску. А ўвогуле, каб пашырыць сферу ўжывання роднай мовы, варта кожнаму пачаць з сябе.

## Вячаслаў Харанека перайшоў на мінералку

*Беларускі асілак, аўтар шматлікіх рэкордаў па ўздыманні цяжкасцяў рыхтуецца да новага дасягнення.*

Харанека збіраецца ўзняць 40-кілаграмовы кег на прамых руках 100 разоў запар. *"Папярэдні падобны рэкорд я ўсталяваў гадоў 10 таму,* — гаворыць ён. — *Тады 100 уздымаў 40-кілаграмовага кега мне даліся за 9 хвілін і 56 секунд".*

Да новага дасягнення Вячаслаў рыхтуецца ў хатніх умовах. Спецыяльна для гэтага ён прынёс 40-кілаграмовы кег дамоў. *"Прачынаюся і пачынаю трэніравацца. Спачатку дома, а потым у спартзале вайсковай акадэміі, дзе працую. Там на прамых руках уздымаю штангу вагой у 50 кілаграмаў,* — расказвае асілак. — *Пастараюся пераўзысці мінулае дасягненне. Падставы для гэтага ёсць. Падчас трэніровак пару разоў запускаў секундамер, які паказвае, што 100 уздымаў кега я раблю хутчэй за мінулае дасягненне".*

Плануецца, што новы рэкорд Вячаслаў Харанека ўсталюе 9 верасня. Ён будзе прымеркаваны да Дня Мінска.

Харанека, які паслядоўна выступае за здаровы лад жыцця, папрасіў, каб у бочку, якую ён збіраецца ўздымаць, налілі мінералкі. *"Раней я ўздымаў піўныя кегі, бочкі з вадой, на гэты раз вырашыў перайсці на мінеральную ваду",* — дадае спартсмен.

**Антон ВІТАЛЬЕЎ.**

## Каранеўскаму паказалі «чырвоную картку»

*Падчас футбольнага матча Лігі чэмпіёнаў паміж барысаўскім БАТЭ і аўстрыйскім "Штурмам" выдалілі з ложы прэсы мінскага стадыёна "Дынама" намесніка генеральнага дырэктара тэлеканала СТБ Паўла Каранеўскага.*



Пра канфлікт паміж БАТЭ і СТБ "Народная Воля" пісала раней. Закончыўся ён тым, што клуб прыпыніў акрэдытацыю канала. Тым не менш намеснік дырэктара Павел Каранеўскі з'явіўся на матчы ў ложы прэсы, але, як высветлілася пазней, трапіў туды па чужой акрэдытацыйнай картцы. Але ўжо пасля першага тайма прэс-аташэ БАТЭ забраў гэты пропуск і папрасіў "таварыша" на выхад.

